Пролетарыі всіх краін, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выдання—XV
№ 257 (4162)
Панядзелак, 21 верасьня 1931 г.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА.

ЗАКОНЧЫЦЬ КАМПЛЕКТАВАНЬНЕ І ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ БЕСЬПЕРАБОЙНЫЯ ЗАНЯТКІ У СЕТЦЫ ПАРТАСЬВЕТЫ

Складанасьць задач сучаснага пэрыяду сацыялістычнага будаўніцтва, новыя ўмовы работы, па-новаму ставяць задачу марксыцка-ленінскага выхаваньня.

Пад кіраўніцтвам партыі ў краіне Саветаў пераможна разгортваецца наступленьне сацыялізму па ўсім фронце. У строй сацыялістычнай індустрыі адзін за адным становяцца новыя прамысловыя гіганты. Зьмяняецца аблічча вёскі, сельска-гаспадарчая вытворчасьць перабудоўваецца на новай сацыялістычнай базе.

Гэта вялікая работа праходзіць у жорсткай барацьбе з клясавым ворагам, які прыкладае апошнія намаганьні, каб адтэрмінаваць сваю пагібель.

Новыя ўмовы работы патрабуюць ад авангарду рабочай клясы, ад кожнага кіраўніка і радавога ўдзельніка сацыялістычнай будоўлі найбольшай клясавай пільнасьці, уменьня арыентавацца ў новай абстаноўцы, распазнаваць клясавага ворага пад якой-бы маскай ён не хаваўся, быць непрымірымымі ў барацьбе з правым і «левым» апартуністычнымі скажэньнямі лініі партыі.

За апошні час значна зьмяніліся абставіны, ускладніліся задачы работы на прадпрыемстве, у калгасе, саўгасе, МТС. Гэта патрабуе ўсямернага ўзмацненьня ідэйна-палітычнага ўзроўню, павышэньня актыўнасьці нізавога зьвяна партарганізацыі — цэх'ячэйкі, партгрупы.

Ад таго, наколькі нізавое зьвяно ўсьвядоміць асаблівасьць сёньнішніх задач, наколькі яно будзе апэрацыйным у сваёй рабоце, у вялікай меры запежыць выкананьне такіх важнейшых мерапрыемстваў, як ліквідацыя абязьлічкі і ўраўнілаўкі, увядзеньне гаспадарчага разрахунку, усёй сумы мерапрыемстваў зьвязаных з выкананьнем вытворчай праграмы кожнага прадпрыемства.

Ускладнілася таксама работа і ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Посьпех калгаснага і саўгаснага будаўніцтва зараз рашае ўпартая, складаная работа па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў — увядзеньне зьдзельшчыны, ліквідацыя абязьлічкі, правільнае разьмеркаваньне даходаў, умелая арганізацыя працы, далейшае правядзеньне масава - растлумачальнай работы сярод аднаасобнікаў беднякоў і сераднякоў, барацьба з правааапартуністычным самацёкам і «левакімі» загібелі.

Гэтыя задачы прад'яўляюць вялікія запатрабаваньні да сельпарткомаў, да кожнай калгаснай і саўгаснай ячэйкі.

У сьвятле гэтых задач выключна важнае значэньне зараз набываюць пытаньні марксыцка-ленінскага выхаваньня членаў і кандыдатаў нашай партыі.

Партыйная асьвета зьяўляецца магутным сродкам у мабілізацыі рабочых і калгасных мас на барацьбу за выкананьне вытворчай праграмы, за ажыцьцяўленьне гаспадарча-палітычных задач калгаснага і саўгаснага будаўніцтва.

Задача марксыцка-ленінскага выхаваньня зараз ставіцца асабліва востра і таму, што рады нашай партыі папаўняюцца новымі кадрамі рабочых, калгасьнікаў, якія ня маюць патрэбнай бальшавіцкай закалкі, ня ўзброены рэвалюцыйнай тэорыяй.

Ахапіць гэту масу людзей сеткай партыйнай асьветы, выхаваць іх у духу ленінізму, выкаваць з іх клясава-загартаваных байцоў — важнейшая задача партыйнай арганізацыі.

Становішча, у якім зараз знаходзіцца партыйная асьвета, — нездавальняючае. У пастанове ЦК КП(б)Б, якая ўчора апублікавана падкрэсьлена, што «сучаснае становішча марксыцка-ленінскага выхаваньня значна адстае ад тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва і не адпавядае тым вялізарным задачам, якія зараз стаяць перад партыяй».

Слабасьць кіраўніцтва сеткай партасьветы з боку райкомаў, недаацэнка марксыцка-ленінскага выхаваньня, адрыў вучобы ад канкрэтных задач вытворчасьці, безкантрольнасьць, бяссыстэмнасьць работы партыйных школ, адсутнасьць патрэбнай колькасьці прокадраў, — усё гэта прывяло да нездавальняючых вынікаў партыйнай вучобы мінулага году.

Урокі мінулага навучальнага году павінны быць цалкам зараз улічаны. Трэба з усёй рашучасьцю біць па тых, хто недаацэньвае партасьвету, хто не забясьпечвае належнай пастаноўкі гэтай важнейшай справы. А такія факты ўжо ёсьць.

У Суражы два разы сарвалася нарада сакратароў і культпропаў ячэек КП(б)Б, якая павінна была прапрацаваць пытаньні партыйнай асьветы. У радзе раёнаў камплектаваньне партсеткі праводзіцца казённым, габінэтным парадкам, без правядзеньня масавай растлумачальнай работы. Шмат дзе яшчэ не прыступілі да камплектаваньня сеткі. Дзе-ні-дзе і па сёкешні дзень раздаюцца галасы, што «партвучоба — другарадная справа, мы перагружаны работай на гаспадарчых кампаніях, зараз няма часу вучыцца» і г. д. Ня цяжка зразумець, што вынаходцы гэтых «аб'ектыўных» прычын зьяўляюцца косьбітамі махровага апартунізму.

Разам з тым, ужо зараз маюцца памылкі і скажэньні дырэктыў партыі ў рабоце па камплектаваньні сеткі. Гэтыя скажэньні выяўляюцца па-першае, у недаацэнцы ўказаньняў ЦК аб прыцягненьні ў сетку партасьветы беспартыйных рабочых, калгасьнікаў і па-другое, у зусім спабым ўцягненьні жанчын. Ня ўсюды таксама партыйныя школы забясьпечаны кіраўнікамі і выкладчыкамі.

Памылкі і скажэньні, якія дапушчаны асобнымі арганізацыямі, трэба выправіць на хаду. Неабходна дабіцца поўнага разуменьня палітычнай важнасьці марксыцка-ленінскага выхаваньня ў сучасны пэрыяд. Кожная партарганізацыя, кожная ячэйка абавязаны партыйную асьвету паставіць у рад важнейшых палітычных задач.

Патрэбна закончыць складаньне сеткі партвучобы, вызначыць кіраўнікоў і выкладчыкаў, правесьці камплектаваньне школ. Гэтая работа павінна быць праведзена ў паказаны ЦК 5-цідзённы тэрмін.

У практычнай рабоце па камплектаваньні сеткі неабходна поўнасьцю захаваць вытворчы прынцып. Пабудаваць вучобу так, каб яна цалкам выходзіла з асаблівасьцяй розных груп рабочых, з асаблівасьцяй данай вытворчасьці. Неабходна ў сетцы партасьветы зьнішчыць абязьлічку, спыніць практыку частых зьмен кіраўнікоў і выкладчыкаў.

Асаблівае значэньне зараз набывае справа ўвязкі вучобы з канкрэтнымі задачамі вытворчасьці, а таксама справа ўкараненьня ў сыстэму партыйнай асьветы элемэнтаў тэхнічнай прапаганды.

Для таго, каб забясьпечыць бесьперабойную работу ва ўсёй сетцы трэба ня толькі падняць дысцыпліну наведваньнікаў, але не адрываць кіраўнікоў і выкладчыкоў школы ад працы.

Задачы, якія вызначаны пастановай ЦК КП(б)Б, будуць выкананы толькі тады, калі практычная работа па разгортваньні сеткі партасьветы будзе пастаўлена на ўзровень ня палітычнага значэньня, калі райпартарганізацыі і кожная ячэйка правядуць шырокую растлумачальную работу, забясьпечаць штодзённае кіраўніцтва і дапамогу школам.

У гэтым напрамку вялікую ролю павінен адыграць як цэнтральны, так раённы і нізавы друк. За спазьненьне і прарывы ў камплектаваньні, за зрыў вучобы разам з партыйным камітэтам адказвае і раённая газэта. На жаль, гэта ня ўсюды яшчэ ўсьвядомлена.

Правільная пастаноўка работы ў школах, гібкасьць форм і мэтадаў вучобы, бесьперабойныя заняткі забясьпечаць яшчэ большае ўзбраеньне партыйных мас рэвалюцыйнай тэорыяй, узмоцняць бальшавіцкую закалку, павысяць пільнасьць кожнага члена і кандыдата партыі ў барацьбе з апартуністычнымі скажэньнямі лініі партыі, у барацьбе за выкананьне задач сацыялістычнага будаўніцтва.

МАНЭЎРЫ ЧАСЬЦЕЙ РСЧА

ПЕРШЫ ЭТАП МАНЭЎРАЎ СКОНЧАН

БАЙЦЫ ПРАЯВІЛІ ВЫСОКУЮ ПАЛІТЫЧНУЮ АКТЫЎНАСЬЦЬ І ДАСКАНАЛУЮ ДЫСЦЫПЛІНАВАНАСЬЦЬ

СОТНІ ЗАЯЎ РАБОЧЫХ І ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ-УДАРНІКАЎ АБ ПРЫЁМЕ Ў РАДЫ КП(б)Б

Раён манэўраў, 18-IX (БЕЛТА). Сёньня пачаліся баявыя дзеяньні бакоў. Вялікую зацікаўленасьць выклікаюць у байцоў дзеяньні авіяцыі і бронявых частак. Надзвычай добра дзейнічаюць авія-часткі. Іх самаадданая работа, ня гледзячы на дрэннае надвор'е выклікае энтузіязм удзельнікаў манэўраў.

Закончыўся першы этап манэўраў. На разборы першага этапу, у прысутнасьці начальніка штабу РСЧА тав. **Ягорава** і начальніка аддзелу баявой падрыхтоўкі тав. **Лапіна**, выступіў галоўны палітыкіраўнік манэўраў тав. **Аранштам**, які адзначыў, што палітапараты вайсковых падзяленьняў прарабілі вялікую падрыхтоўчую работу па мабілізацыі ўвагі мас вакол манэўраў. Узрасла палітычная актыўнасьць і сьвядомасьць байцоў. На сёньнішні дзень у падзяленьнях палкоў няма ні аднаго дысцыплінарнага праступку. Сотні байцоў падалі заявы аб уступленьні ў партыю, камсамол і ў калгасы.

З ацэнкай апэрацыйных дзеяньняў бакоў выступіў галоўны кіраўнік манэўраў тав. **УБАРЭВІЧ**.

МАНЭЎРЫ ВЫКЛІКАЛІ

вялікі ўздым вытворчага энтузіязму

ПАДРЫХТОЎКА ДА МАНЭЎРАЎ НА ЗАВОДЗЕ «ЧЫРВОНЫ ТЭКСТЫЛЬШЧЫК» ПРАЙШЛА ПАД ЗНАКАМ ВЯЛІЗАРНАГА ЎЗДЫМУ ПАЛІТЫЧНАЙ І ВЫТВОРЧАЙ АКТЫЎНАСЬЦІ РАБОЧЫХ. У РАДЫ АСОАВІЯХІМУ ЎСТУПІЛА 100 ЧАЛАВЕК. УВЕСЬ КАЛЕКТЫЎ МАТАЛЬНАГА ПЭХУ ЎСТУПІЎ У ЯЧЭЙКУ АСОАВІЯХІМУ.

У ПАРТЫЮ ПАДАНА 7 ЗАЯЎ.

«У МОМАНТ ПРАВЕРКІ ГАТОЎНАСЬЦІ ДА АБАРОНЫ ПРАЛЕТАРСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ І МАБІЛІЗАЦЫІ РАБОЧАЙ КЛЯСЫ НА ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ ЗАДАНЬНЯЎ ТРЭЦЯГА РАШАЮЧАГА ГОДУ, — ГАВОРЫЦЦА Ў ЗАЯВАХ,—МЫ ЖАДАЕМ ЎСТУПІЦЬ У РАДЫ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ».

ФАБРЫКА ЗАКЛЮЧЫЛА САЦДАГАВОР СА ШПАЛЕРНАЙ ФАБРЫКАЙ. РАБОЧЫЯ АБАВЯЗАЛІСЯ ЛІКВІДАВАЦЬ ПРАРЫЎ У ВЫКАНАНЬНІ ПРАМФІНПЛЯНУ, АХАПІЦЬ САЦСНАБОРНІЦТВАМ І ЎДАРНІЦТВАМ НЯ МЕНШ 90 ПРОЦ. РАБОЧЫХ, УЦЯГНУЦЬ У ПАРТЫЮ ЛЕПШЫХ РАБОЧЫХ, ПОЎНАСЬЦЮ ЎЦЯГНУЦЬ РАБОЧЫХ У ЯЧЭЙКУ АСОАВІЯХІМУ.

***

РАБОЧЫЯ **МЕНСКАЙ АБУТКОВАЙ ФАБРЫКІ** ВЫКЛІКАЛІ НА САЦПАБОРНІЦТВА, У СУВЯЗІ З МАНЭЎРАМІ РСЧА, ГАЛЯНТАРЭЙНУЮ ФАБРЫКУ «ЎСХОД». РАБОЧЫЯ ЎЗЯЛІ НА СЯБЕ АБАВЯЗАК ПОЎНАСЬЦЮ ЛІКВІДАВАЦЬ БРАК, ПАЛЕПШЫЦЬ ЯКАСЬЦЬ ПРАДУКЦЫІ, БОЛЬШ УВАГІ АДДАВАЦЬ ШЭФСТВУ НАД ЧЫРВОНАЙ АРМІЯЙ, ДАПАМАГЧЫ ЎБОРАЧНАЙ КАМПАНІІ Ў ПАДШЭФНЫХ СЕЛЬСАВЕТАХ, ПРАВЕСЬЦІ ШЫРОКУЮ РАБОТУ ПА ВАЯНІЗАЦЫІ. ПА ЎСІХ ЦЭХАХ ПРАВЕДЗЕНЫ МІТЫНГІ АБ ЗНАЧЭНЬНІ МАНЭЎРАЎ.

Р.

БЛІСКУЧЫЯ УЗОРЫ

камсамольскай прыкладнасьці на манэўрах

Камсамолец Карнюшэнка знаходзіўся ў выведцы. Пры сустрэчы з «праціўнікам» ён быў пасланы з данясеньнем да камандзіра палка. Для выкананьня баявога даручэньня пасланаму Карнюшэнку трэба было пераправіцца праз раку, што ён не задумваючыся зрабіў.

Плынь падхапіла і панесла яго. Карнюшэнка ледзь выбраўся з вады, але ўсё-ж у другі раз кінуўся ў другую раку для скаратэньня шляху.

Данясеньне было дастаўлена ў тэрмін.

Камсамолец Дудзэнка з двума камандзірамі — старшынёю Юдзіным і камандзірам разьдзелу Законным — выратавалі з вады тонучую павозку з баявой маемасьцю.

Дзякуючы асабістай прыкладнасьці камсамольцаў № палка, у два першыя дні паходу падана 12 заяў аб прыёме ў камсамол.

Дырэктыва ПУР'а аб ахопе камсамолам батрацка-рабочай праслойкі ў часе манэўраў цалкам выканана. Рабоча-батрацкая моладзь зьяўляецца камсамольцамі.

Байцы гатовы выканаць загад

(Гутарка з нам. галоўнага палітыкіраўніка манэўраў тав. Жыльцовым)

У падрыхтоўцы да манэўраў часьці акругі праявілі вялікую работу.

Байцы гатовы выканаць усе пастаўленыя перад манэўрамі трэцяга рашаючага году задачы.

У радзе часьцей № дывізіі, у выніку высокай палітычнай сьвядомасьці байцоў, выразнага кіраўніцтва камандзіраў і палітработнікі, пры сапраўды бальшавіцкай рабоце партыйных арганізацый, удалося дабіцца таго, што многія падзелы часьцей за бягучы месяц ня маюць ні аднаго дысцыплінарнага спагнаньня.

У часьцях гэтай-жа дывізіі да моманту выступленьня ў паход ёсьць дзесяткі заяў аб уступленьні ў партыю, у камсамол і калгасы.

Слабым месцам у рабоце паліторгана усіх ступеняй і партыйна-камсамольскіх арганізацый зьяўляецца тое, што часта ў іх канкрэтнай і штодзённай падрыхтоўчай дзейнасьці, упускаюцца моманты агульна-палітычнага характару.

Посьпех ва ўсёй рабоце можа быць дасягнуты толькі ў тым выпадку, калі паліторганы, партыйна - камсамольскія арганізацыі, кожны камуніст і камсамолец пасобку ўсю сваю работу будуць узязаць з пытаньнямі сацыялістычнага будаўніцтва нашай краіны і з міжнароднымі падзеямі.

Насельніцтва раёну манэўраў горача сустракае Чырвоную армію. Я быў у шмат якіх калгасах, дзе бачыў падрыхтоўчую работу калгасных мас. Арганізацыя чырвоных абозаў імя Чырвонай армії, заклады сёлсгасных ям, датэрміновае выкананьне збожжазагатовак, актыўны ўдзел у рамонце дарог і мастоў — вось канкрэтныя дзеяньні калгасаў.

Ёсьць упэўненасьць, што часьці акругі з задачамі манэўраў справяцца з посьпехам і гэтым самым пішуць раз пацьвердзяць сваю бязьмежную адданасьць справе пралетарскай рэвалюцыі і гатоўнасьць пераможна абараняць сваю пралетарскую бацькаўшчыну.

На манэўрах: газэта выйшла.

Клюбы і хаты чытальні да манэўраў

У сувязі з манэўрамі РСЧА вялікія задачы ўскладаюцца на ўсе культасьветныя ўстановы. Клюбы, нардамы, сады, хаты-чытальні і чырвоныя куткі павінны зараз-жа разгарнуць масавую растлумачальную работу да манэўраў. У гэту працу трэба ўцягнуць увесь культактыў, сялянскі канкрэтны пляны работы на час манэўраў, вылучыць брыгады для работы сярод працоўнага насельніцтва гораду, сярод рабочых саўгасаў і МТС, сярод калгаснікаў, беднякоў і сераднякоў на вёсцы.

Кожная культасьветная ўстанова павінна стаць цэнтрам масавай агітацыі і прапаганды па растлумачэньні ўнутранога і міжнароднага становішча СССР, задач Чырвонай арміі і працоўнага насельніцтва ў справе абароны краіны.

Правядзеньне сходаў, арганізацыя дакладаў і гутарак, чытка газэт і мастацкай літаратуры аб баявых дзеяньнях часьцей Чырвонай арміі ў часе грамадзянскай вайны і мірнай вучобы Чырвонай арміі, арганізацыя справачнай работы — усё гэта павінна заняць належнае месца ў рабоце кожнага клюбу, нардому, хаты-чытальні і чырвонага кутка.

Таварыская сустрэча часьцей Чырвонай арміі, азнаямленьне працоўнага насельніцтва з ваеннай тэхнікай, з жыцьцём і бытам арміі і азнаямленьне чырвоназармейцаў з посьпехамі напала сацыялістычнага будаўніцтва — набывае важнае значэньне ў рабоце культасьветных устаноў.

Кожная культасьветустанова павінна ўжо зараз падрыхтаваць лёзунгі, прысьвечаныя манэўрам Чырвонай арміі, вылучыць бібліятэчкі-перасоўкі, агітфурманкі, кіно-перасоўкі, складзьці рэкамэндацыйныя сьпісы па вайсковай літаратуры, падабраць кадр чытачоў, дэкламатараў, кніганош, агітатараў і праінструктаваць іх; навесьці масавую работу па садзейнасьці грамадзкім арганізацыям ва ўцягненьні новых членаў у Асоавіяхім, Аўтадор, ТПР, Чырвоны крыж і інш; арганізаваць збор сродкаў на дырыжабліабудаўніцтва, на матарызацыю пагранчасьцей.

Усякім спробам кулака навесьці агітацыю, каб аслабіць баявую магутнасьць Чырвонай арміі, трэба навесьці руйнуючы ўдар.

Падрыхтоўчая работа да манэўраў павінна быць накіравана на скацэнтраваньне ўвагі працоўных мас вакол выкананьня народна-гаспадарчага пляну. Адзначыць манэўры Чырвонай арміі выкананьнем прамфінпляну, сканчэньнем асеньняй сяўбы, арганізацыяй чырвоных абозаў, стварэньнем новых калгасаў.

У адзнаку салідарнасьці з ангельскімі маракамі

па-ўдарнаму правядзем манэўры

Раён манэўраў (БелТА). Паўстаньне ангельскіх маракоў выклікала вялікі ўздым сярод байцоў манэўруючых часьцей Чырвонай арміі.

Байцы № палка заявілі, што яны, у адзнаку брацкай салідарнасьці з ангельскімі маракамі, якія сарвалі манэўры ангельскага флёту—зброі імпэрыялістычнай вайны—па-ўдарнаму правядуць манэўры РСЧА

Стопроцантная яўка на прызыў

ДУБРОЎНА. (Наш кар.). 15 верасьня ў Дуброўне пачаўся прызыў. Яўка на прызыў стопроцантная. Шмат прызыўнікоў адмаўляецца ад ільгот. На прызыўным пункце разгорнута вялікая культурна-палітычная работа. Праводзяцца гутаркі аб навейшай гісторыі Чырвонай арміі, чытка газэт і г. д.

Ня ўсе сельсаветы поўнасьцю ўявілі задачы прызыву. Ляднянскі, Сазонаўскі, Верацейскі і Азаранцкі сельсаветы не ліквідавалі няпісьменнасьць сярод прызыўнікоў. Мала аддае ўвагі рабоце прызыўной камісіі і райком камсамолу.



На манэўрах паходная рэдакцыя

СІЛАС У ДНІ МАНЭЎРАЎ

ЗАВАЯВАЦЬ РАШАЮЧЫ ПЕРАЛОМ

На фронце барацьбы за сілас

1-е кастрычніка—апошні кантрольны тэрмін сіласаваньня. Ня гледзячы на гэта, большасьць калгасаў БССР усё яшчэ цягнецца ў глыбокім тыле барацьбы за кармовую базу.

На 10-га верасьня калгасы выканалі ўсяго 18 проц. гадавога пляну сіласаваньня.

Больш за ўсё адстаюць калгасы наступных раёнаў: **Бярэзінскі**, выканаў план **на 1,8 проц.**, **Вузьдзенскі**—2,3 проц., **Клічаўскі**—5,1 проц., **Крупскі**—6,2 проц., **Пранойскі**—0,9 проц., **Рэчыцкі**—1,6 проц., **Чаўускі**—3,3 проц., **Нараўлянскі**—1,8 проц.

Працаўнікі гэтых райкалгассаюзаў у тым ліку і спэцыялісты большасьць часу сядзяць у габінэтах раённых канцылярый, чым у калгасах.

Адзначаючы нездавальняючы ход сіласаваньня па калгасах, праўленьне Калгасцэнтру БССР пастанавіла:

20-га верасьня заслухаць справаздачы членаў праўленьняў калгассаюзаў, адказных за ход сіласаваньня — **Бярэзінскага, Вузьдзенскага, Клічаўскага, Нараўлянскага і Чаўускага раёнаў.**

За поўны зрыў сіласаваньня ў калгасах абвясьціць **суровую вымову старшыням Крупскага, Рэчыцкага і Расонскага** райкалгассаюзаў.

Райкалгассаюзам прапанавана прымаць самыя суровыя меры ўзьдзеяньня праўленьняў і старшынь калгасаў, якія нядбайна адносяцца да сіласаваньня, расцьньваючы зрыў сіласаваньня, зрыў кармавой базы, ня апартунізм на практыцы, як дапамога клясаваму ворагу—куляку.

Праўленьням калгассаюзаў даручана не пазьней 20 верасьня надань сьпіс калгасаў і паасобных калгаснікаў, якія выканалі і перавыканалі плян сіласаваньня, для прэміяваньня.

Прымаючы пад увагу, што ў некаторых калгасах сіласаваньне ў ямах і траншэях затрымліваецца з прычыны блізасьці грунтавых вод, калгассаюзам прапанавана ў такіх калгасах арганізаваць сіласаваньне ў надземных устаноўках.

1.000 га сенажаці ня скошаны

МАЗЫР. (Наш кар.). Мазырскі раён—жывёлагадоўчы. Але пытаньні стварэньня кармовай базы, забясьпячэньня кармамі жывёлы на ўвесь стойлівы пэрыяд даегэтуль яшчэ ня сталі ў цэнтры ўвагі раённай партыйнай арганізацыі.

Каб у гэтым упэўніцца, даволі азнаёміцца з ходам сенаўборкі і сіласаваньня. У Мазырскім раёне яшчэ ня скончана ўборка сенажацяй першага ўкосу на плошчы ў 1.000 га.

Калгас «Шлях камуны», Капліцкага сельсавету, не скасіў 100 га сенажаці, калгас «Новыя Шарэйкі», Юравіцкага сельсавету, яшчэ не скасіў 40 га, калгас «Чырвоны маяк» — 50 га і саўгас «Ліпава»—65 га.

Асноўнай прычынай дрэннага ходу ўборкі сена ў большасьці калгасаў зьяўляецца тое, што работа там яшчэ не праведзена на зьдзельшчыну, у выніку сярод калгасьнікаў няма зацікаўленасьці, каб узьняць прадукцыйнасьць працы.

Абвешчаны ЦК КП(б)Б ударны двухмесячнік па ліквідацыі прарываў у жывёлагадоўлі Мазырскі раён павінен скарыстаць для таго, каб поўнасьцю забясьпечыць кармамі саўгаснае і калгаснае стада.

ЮШКЕВІЧ.

Сіласныя культуры ўжо пажоўклі

ВУШАЧЫ. (Наш кар.).

Адсутнасьць усякай масава-растлумачальнай работы сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў прывяла да таго, што ў ВУШАЧЧЫНЕ, зьмяна - жывёлагадоўчым раёне, сіласаваньню пагражае поўны зрыў. На 10-е верасьня плян выканан па раёне ўсяго ў разьмеры 7,4 проц.

Рад сельсаветаў і партячэек упартаго ня выконваюць дырэктывы партыі аб стварэньні кармовай базы. У выніку ў Сайскім сельсавеце з 355 тон засіласавана 10, у Воцлаўскім замест 250 — 18 тон, у Жэрскім замест 210—28, у Чарапоўшчынскім замест 245 засіласавана 5.

Ужо пара касіць бульбянік, але ў радзе калгасаў, як «Пралетары», «Чырвоная Зьвязда», яшчэ ня ўбралі сіласныя культуры, якія ўжо перасьпелі.

Ліквідацыя прарыву на адказнейшым участку жывёлагадоўлі патрабуе тэрміновых і канкрэтных мер з боку раённых арганізацый. Вакол сіласаваньня трэба зараз згуртаваць усю калгасную масу, растлумачыўшы значэньне сілясу.

Абвешчаны камсамолам дэкаднік паходу за сілас павінен вывесьці Вушачыну з прарыву і забясьпечыць поўнае выкананьне пляну.

ЛІПАЎКА.

Уборкай атавы і сіласаваньнем

забясьпечым кармамі калгаснае стада

ЧАШНІКІ. (Наш кар). У Чашніцкім раёне пытаньні жывёлагадоўлі, пытаньні стварэньня кармовай базы яшчэ ня сталі асноўнай зачачай раённых арганізацый. Пістарычная адозва партыі і ўраду аб разгортваньні жывёлагадоўлі даегэтуль яшчэ не дасведзена да калгасных мас. Амаль у кожным калгасе на 13-е верасьня заставалася нескошаным па 3-4 га першага ўкосу. У калгасе вёскі «Старыя паўні», Старажэвіцкага сельсавету, яшчэ не скошана 30 га сенажацяй першага і другога ўкосу на добрых заліўных лугах.

У гэтым калгасе, які арганізаваўся ў канцы вясны 1931 году, не абачасе веснавой сяўбы 1931 году, не абчасе пасевы. Кожны калгасьнік сам убірае свае участкі і большасьць часу заняты ў сваёй уласнай гаспадарцы. Уборкай-жа ён уласнай гаспадарцы. Уборкай-жа калгаснай сенажаці ніхто ня цікавіцца. Зьдзельшчына ў гэтым калгасе ня ўведзена.

У калгасе «Камунар» з прычыны яўнога прынцыпу разьмеркаваньня яблык, малака і інш. прадуктаў зьдзельшчына фактычна зведзена на нішто. Значная частка калгасьнікаў ня выходзіць на работу. Нават сярод прыкладных калгасьнікаў упала зацікаўленасьць калгаснай вытворчасьці, бо яны атрымліваюць нарадні з гультямі.

У выніку ў калгасе яшчэ ня скошаны 7 га сенажацяй першага ўкосу. У сьлінагадоўчым саўгасе «Почасёлы» даегэтуль яшчэ ня скошаны 20 га першага і другога ўкосу. На запытаньне—чаму ня ўбіраецца сенажаць, дырэктар саўгасу адказаў:

— Усё роўна не пасьпеем убраць, таму ня варта і пачынаць.

Да сіласаваньня ў большасьці калгасаў падыходзяць фармальна, выкапаюць на адной яме і гэтым абмяжоўваюцца, ня гледзячы на тое, што да поўнага выкананьня пляну яшчэ далёка.

Райкалгассаюз не наладзіў апэрацыйнага кіраўніцтва барацьбой за кармавую базу. Досыць сказаць, што раённы аграном за апошні час ні разу не выязджаў у калгасы, а сядзіць увесь час дома і капаецца ў розных паперках. У раёне арганізавана каля 18 калгасных фэрм, але ў палове з іх ня было пішоднага раённага спэцыяліста.

Так кіраваць калгаснай вытворчасьцю далей нельга. Трэба жарэзным чынам перабудаваць сваю работу. Пачэсьці сядзець у кабінэтах райкалгассаюзу—пабольш непосрэдна ў калгасах, бліжэй да калгаснай вытворчасьці.

Стада племгасу ім. Коніцкіх.

ІЛЬНАВОДЗТВА СПАЛУЧЫЦЬ З РАЗГОРТВАНЬНЕМ КАЛГАСНАЙ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ

ВІЦЕБСК. (Наш спецкарэспандэнт). На хуставой нарадзе сакратароў райкомаў КП(б)Б, загалічкай раёна і старшынь райкалгассаюзаў ільнаводных раёнаў, як асноўнае пытаньне, абгаворвалася задачы ільнаводных раёнаў у разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Старшыня Белкалгасцэнтру тав. Міцькоў у сваім дакладзе, характарызуючы становішча жывёлагадоўлі ў ільнаводных раёнах, падкрэсьліў, што спэцыялізацыя раёнаў у напрамку ільнаводзтва праходзіць пры недастатковай увазе жывёлагадоўлі.

Раённыя кіруючыя арганізацыі не ўлавілі добра таго, што спэцыялізацыя ў галіне ільнаводзтва непарыўна зьвязана з разьвіцьцём жывёлагадоўлі. Кожнаму вядома, што канюшыны і зьяўляюцца лепшым трутнам для пасеву ільну. У готы-ж час канюшына — лепшы корм і для жывёлы. Такім чынам, адначасова вырашаецца кармовая база для жывёлы і забясьпечваецца ўсьпяшчэ ўраджайнасьці ільну.

Камплектаваньне таварнага стада жывёлы на 1-га верасьня выканана па БССР па 70 проц. ільнаводчых раёнаў дасягнулі толькі 59 ПРОЦ. Кантрольная лічба па арганізацыі 181 таварнай фэрмы перавыкавана.

У ільнаводчых раёнах арганізавана 241 фэрма, але і зараз 20 проц. калгасаў НЯ МАЮЦЬ АГРАМАДЖАНАГА СТАДА. Гэта гаворыць аб тым, што раённыя кіруючыя арганізацыі не паставілі ў центры ўвагі пытаньня камплектаваньня калгаснага стада за кошт уласных рэсурсаў калгасьнікаў.

Па камплектаваньні стада жывёлы асаблівa адстае Дуброўенскі раён — 31 проц., Дрысенскі, Асьвейскі — 39 проц., Гарадоцкі — 33 проц. і інш. Упарадзе ідуць Лепельскі — 107 проц., Крупскі — 94 проц. і некаторыя іншыя.

Асноўная задача калгасаў на даным этапе — дабіцца яваных паказальнікаў. Мала арганізаваць фэрму, трэба яе замацаваць, адладзіць арганізаваўшы працу.

Па БССР у гэтым годзе павінна быць арганізавана 700 цялячых фэрм, але раёны не ўлавіліся сур'ёзна за вырашаньне гэтай задачы. Існуюць думкі, што гадоўля цялят справа нявыгодная. Гэта зусім недапушчальнае зьявішча. Цялячыя фэрмы павінны зьявіцца базай будучых таварна-прадукцыйных малочных фэрм.

У выніку такога ігнараваньня справы арганізацыі таварна-малочных фэрм, ільнаводчыя раёны плян здачы малочнай прадукцыі выканалі толькі на 48 проц. у той час, калі па БССР выканана на 67 проц., што таксама далёка ад поўнага выкананьня. Ганебна адстае аднаасобны сэктар: з 24 тыс. тон малака, зданага па ільнаводчых раёнах, аднаасобны сэктар адаў толькі 3.000 тон.

Каапэрацыя яшчэ не перабудавала сваёй работы, не навучылася лёгка абслугоўваць сацыялістычны сэктар. У выніку бываюць такія выпадкі, што таварная прадукцыя ня прымаецца каапэрацыяй, прывозіцца назад і гніе, як напрыклад, нераган малака, які з посьпехам можна выкарыстаць для вырабу тварагу.

Арганізаваць працу ў жывёлагадоўчых фэрмах — галоўная задача калгасаў. У склад скотнікаў, сьвінароў, даярак часта трапляюць клясава-варожыя элемэнты, якія толькі шкодзяць. Чыстка гэтага складу —неабходная ўмова аздараўленьня догляду жывёлы. Абязьлічка павінна быць рашуча зьнішчана. Штат скотнікаў трэба замацаваць пастаянны.

Зьдзельшчына, адменная ў працадзнях, павінна быць увядзена ў залежнасьці ня толькі ад колькасьці працы, але і ад якасьці. Трэба шырока практыкаваць вывораныя нарады па спэцыяльнасьці: напрыклад, даярак, сьвінароў, загадчыкаў фэрм і г. д.

Забясьпечыць належным кіраўніцтвам таварна-малочныя фэрмы і дабіцца рашучага зруху ў пытаньні жывёлагадоўлі ў ільнаводчых раёнах — чарговая задача партарганізацыі.

А. М.

Папраўка

Ва ўчэрашнім нумары «Зьвязды» па нядбайнасьці праўшчыка ў канцы загалоўку перадавога артыкулу замест клічніка пастаўлен пытальнік.

Правільны загаловак павінен чытацца: АПРАЦАВАЦЬ ЛЁН!

На вінаватага накладзена пакраньне.

КОЖНЫ КАМУНІСТ НА ВЫТВОРЧАСЬЦІ— арганізатар мас на барацьбу за рэалізацыю задач, указаных у прамове т. Сталіна

НІ АДНАГО КАМУНІСТА І КАМСАМОЛЬЦА—ПА-ЗА УДАРНЫМІ БРЫГАДАМІ

ПАЗЫКА „ТРЭЦІ РАШАЮЧЫ"

АРГАНІЗУЕМ МАСАВУЮ ПРАВЕРКУ АФАРМЛЕНЬНЯ ПАЗЫКІ

Камісіі садзейнасьці і прафарганізацыі—ваш абавязак дабіцца ліквідацыі разрыву паміж падпіскай і афармленьнем

Весткі Наркамфіну аб ходзе падпіскі на пазыку імя трэцяга рашаючага году ілюструюць сьведчаць, што многія раёны недаацанілі палітычнае значэньне кампаніі.

Побач з радам раёнаў, якія перавыканалі кантрольныя лічбы падпіскі (ВІЦЕБСК—105,5 проц., КЛІМАВІЧЫ—127,2 проц., КРЫЧАЎ—114,7 проц., ГОМЕЛЬ, ЖЛОБІН і г. д.) ёсьць і раёны, якія ганебна правальваюць падпіску і яе афармленьне. Так, АСЬВЕЙСКІ раён выканаў толькі 43,4 проц. заданьня, ВЕТКАЎСКІ—49,1 проц., РАСОНСКІ—48 проц. і г. д.

Акрамя гэтага, мы маем вялізарны разрыў паміж сумай прынятай падпіскі і сумай, з якой фактычна паступаюць узносы ў банкі і касы. Афармленьне падпіскі праходзіць надзвычай марудна. Да 10 верасьня афармлена толькі 70 проц. Асноўнай прычынай разрыву паміж падпіскай і афармленьнем пазыкі зьяўляецца тое, што крэдытна-фінансавы апарат НЯ ЗДОЛЕЎ СПРАВІЦЦА З АРГАНІЗАЦЫЙНЫМ ЗАМАЦАВАНЬНЕМ ВЫНІКАЎ ПАДПІСКІ.

Касы ашчаднасьці, крэдытна-банкаўскія ўстановы зьнізілі сваю актыўнасьць і, замест бальшавіцкай барацьбы за афармленьне падпіскі, за паступленьне узносаў, спадзяюцца на самацёк.

Рад ўстаноў па «тэхнічных» прычынах да гэтага часу яшчэ не пачалі адтрымліваць узносы па пазыцы.

Разрыву паміж афармленьнем і падпіскай садзейнічае таксама і цякучасьць рабочай сілы, якая яшчэ ня зьнішчана. Да пачатку першых узносаў частка рабочых па тых ці іншых прычынах перакінута на іншыя прадпрыемствы і там з іх ня ўтрымліваюцца ўзносы па пазыцы.

У той-жа час мапа што робіцца для ахопу тысяч новых рабочых, якія прыходзяць на фабрыкі і заводы.

Асабліва слаба пастаўлена работа па ахопу сазонынікаў. Вялікая частка сезонынікаў, асабліва тарфянікаў, сплаўшчыкаў, лесазагатоўшчыкаў і г. д., яшчэ не падпісалася на пазыку.

Недапушчальна адстае распаўсюджваньне пазыкі ў адзіначособным сэктары. На 10 верасьня плян распаўсюджваньня пазыкі сярод адзіначособнікаў выканан толькі на 25,2 проц. Райкомы МОПР'у, якія заключылі дагавор з Наркамфінам на рэалізацыю пазыкі сярод адзіначособнікаў, у радзе месц да гэтай работы яшчэ не прыступілі.

Выкананьне заданьня па групе рабочых і служачых ні ў якім разе ня можа служыць апраўданьнем для паспаблёнкі сярод рабочых і служачых вялізарны і павінны быць хутчэй выкарыстаны.

Непаваротлівасьці, слабой рабоце фінансава-крэдытнага апарату па афармленьні падпіскі павінен быць пакладзен канец.

Трэба ўзмацніць масавую работу сярод адзіначособнікаў і з усёй сілай ударыць па апартуністычнай недаацэнцы кампаніі. Капгасы павінны дапамагчы крэдытным установам у гэтай рабоце і ўзяць на буксір адзіначособны сэктар.

Работа па пазыцы не павінна спыняцца ні на адзін дзень.

Да афармленьня падпіскі не прыступілі

ДУБРОЎНА. (Наш кар.).

Боеўскі сельсавет атрымаў заданьне рэалізаваць аблігацый на 15.500 руб. З-за зусім безадказных адносін сельсавету да рэалізацыі, заданьне выканана на мізэрны процант. З 11 калгасаў сельсавету 6 калгасаў далі падпіску на 1.100 руб., з якіх афармлена толькі 500. 2 кулацка-заможныя гаспадаркі атрымалі цьвёрдае заданьне па пазыцы, але гэтае заданьне ня выканана, бо ніякіх мер грамадзкага ўздзеяньня ў адносінах да кулакоў сельсавет не прыняў. За мазуны разьлік прадана аблігацый толькі на 80 руб. Апартуністычная недаацэнка пазыкі трэба пакласьці канец.

Дагавор не рэалізуецца

ЧАВУСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ МОПР'у НЯ ВЫКОНВАЕ СВАІХ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ

ЧАВУСЫ. ЦК МОПР'у БССР, у адказ на фашысцкі тэрор у Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне, абавязаўся рэалізаваць сярод адзіначособнікаў БССР пазыку на 3.800.000 руб. Чавускі райком МОПР'у павінен быў рэалізаваць аблігацый на 71 тыс. руб. Але ён гэтай справай не займаецца і зусім ня цікавіцца ўзятым на сябе абавязацельствам.

Наогул, рэалізацыя пазыкі па адзіначособным сэктары ў Чавускім раёне праходзіць нездавальняюча. Ні раённая камісія садзейнасьці дзяржкрэдыту, ні райвыканкамы нічога не зрабілі, каб дабіцца выкананьня кантрольнай лічбы па пазыцы, каб пашырыць на вёску спрабаваныя мэтады рэалізацыі пазыкі ў горадзе. У выніку—у Чавускім раёне рэалізавана аблігацый сярод адзіначособнікаў на 5 проц.

Б.

Да ўвагі парт'ячэйкі ЦКК

Яшчэ ў сакавіку б. г. прэзыдыум ЦКК прымацаваў рад работнікаў НК-РСІ да буйнейшых прадпрыемстваў Менску для дапамогі і арганізацыі шэфскай работы на прадпрыемствах. Але да гэтага часу большасьць прымацаваных таварышоў да работы не прыступіла, не цікавіцца пастаноўкай шэфскай працы на прадпрыемствах.

Вось прозьвішчы гэтых таварышоў: Сьцефановіч—прымацаваны да хэмфарм заводу, Жук—да Эльводу, Вэрба—да абутковай фабрыкі, Шундлераў—да заводу «Полымя рэвалюцыі», Бабак—да Бойні, Ярыгін—да МБВ чыг., Верстак—да мясцкому грузчыкаў і г. д.

Парт'ячэйка НК-РСІ павінна забясьпечыць сапраўдную дапамогу з боку работнікаў ЦКК-РСІ арганізацыі шэфства прадпрыемстваў над установамі.

Райкамісія садзейнасьці фактычна ня існуе

ВЕТКА. Спачатку кампаніі рэалізацыі пазыкі імя трэцяга рашаючага, раённая камісія садзейнасьці дзяржкрэдыту зрабіла толькі адно пасяджэньне. На гэтым яна спыніла сваю работу. Няма ніякага кіраўніцтва работай контрагентаў, камісія ні разу не заслухоўвала іх справаздач. Яна зусім нічога ня ведае аб тым, як працуюць кізавыя камісіі садзейнасьці; конкурс на лепшы камсод не праводзіцца. Старшыня райкамісіі за ўвесь час ні разу ня выехаў у сельсаветы. Так далей працаваць нельга!

РЭЗЬНІКАЎ.

Шклоўскія мопраўцы разгарнулі вялікую работу

ШКЛОЎ. Мопраўская арганізацыя Шклоўшчыны праводзіць вялікую работу па рэалізацыі пазыкі сярод адзіначособнікаў, паводле сакрэтару ЦК МОПР'у БССР з Наркамфінам. Праведзена нарада мопраўскага актыву з удзелам прадстаўнікоў мясцовых арганізацый. 15 актывістаў пасланы ў сельсаветы. Даны кантрольныя лічбы вясковым ячэйкам.

Мопраўскія арганізацыі фабрыкі «Спартак», заводу «Бараньба» і льнозаводу праводзяць шырокую растлумачальную работу закон абавязацельства МОПР'у.

ЗАРЭЦКІ.

Да ўвагі парт'ячэйкі ЦКК

Яшчэ ў сакавіку б. г. прэзыдыум ЦКК прымацаваў рад работнікаў НК-РСІ да буйнейшых прадпрыемстваў Менску для дапамогі і арганізацыі шэфскай работы на прадпрыемствах. Але да гэтага часу большасьць прымацаваных таварышоў да работы не прыступіла, не цікавіцца пастаноўкай шэфскай працы на прадпрыемствах.

Вось прозьвішчы гэтых таварышоў: Сьцефановіч—прымацаваны да хэмфарм заводу, Жук—да Эльводу, Вэрба—да абутковай фабрыкі, Шундлераў—да заводу «Полымя рэвалюцыі», Бабак—да Бойні, Ярыгін—да МБВ чыг., Верстак—да мясцкому грузчыкаў і г. д.

Парт'ячэйка НК-РСІ павінна забясьпечыць сапраўдную дапамогу з боку работнікаў ЦКК-РСІ арганізацыі шэфства прадпрыемстваў над установамі.

НАРАДА ПРЫ ЦКК КП(б)Б

У сваёй пастанове ад 21 сакавіка г. г. ЦК УсесКП(б) паставіў перад партарганізацыямі выразную задачу—«дабіцца ў самы кароткі тэрмін ажыцьцяўленьня дырэктыў XVI зьезду партыі аб палалоўным удзеле камуністаў і камсамольцаў у сацыялістычным спаборніцтве і ўдарніцтве».

18 верасьня адбылася, скліканая партколегіяй ЦКК КП(б)Б, нарада сакратароў партколектываў і прафработнікаў буйнейшых прадпрыемстваў Менску з удзелам прадстаўнікоў ад ЦСПСВ і ЦП металістаў, чыгуначнікаў і іншых саюзаў. Нарада паставіла перад сабой задачу праверыць, як рэалізуецца паказаная пастанова ЦК.

Матар'ялы абсьледаваньня раду прадпрыемстваў Віцебску, Гомелю, Магілеву і іншых прамысловых цэнтраў БССР, а таксама выступленьні з месц сьведчаць аб тым, што асноўная маса камуністаў на заводах і фабрыках Беларусі адыгрывае вядучую ролю ў справе разгортваньня сацыялістычных форм і мэтадаў работы, зьяўляецца застрэльшчыкам рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў і г. д. Прычым на тых прадпрыемствах, дзе партыйныя арганізацыі сталі на чале творчай ініцыятывы рабочых мас, вытворчыя праграмы выконваюцца і перавыконваюцца.

На заводзе «БАЛЬШАВІК», дзе 98 проц. камуністаў на справе прымаюць удзел у спаборніцтве і ўдарніцтве, дзе партыйная арганізацыя ня мае на вытворчасьці ні аднаго прагулу з боку членаў і кандыдатаў партыі, дзе пераважная большасьць камуністаў актыўна ўдзельнічае ў рацыяналізацыі вытворчасьці—прамфінплян сыстэматычна ПЕРАВЫКОНВАЕЦЦА, пяцігодка на прадпрыемстве ВЫКАНАНА за два з паловай гады.

Нядаўна на заводзе адбыўся мітынг па пытаньні аб датэрміновым выкананьні праграмы трэцяга кварталу гаспадарчага году. Адміністрацыя заводу разьлічвала закончыць гэту праграму 27 верасьня. Аднак, рабочыя-камуністы ў часе мітынгу высунулі сустрэчную прапанову выканаць плян трэцяга кварталу не пазьней 26 верасьня. Гэта прапанова аднадушна была падтрымана ўсім рабочым калектывам заводу.

Такія факты характэрны і для многіх іншых прадпрыемстваў Беларусі (друкарня імя Сталіна, «Камунарка», кушнерная фабрыка, лямцавая і інш.).

За апошні час значна павялічыўся ўдзел вытворчых камсамольскіх калектываў і ячэек у барацьбе за ўдарныя тэмпы работы на вытворчасьці. Так, на кушнернай фабрыцы камсамольскі цэх узяў на сябе абавязак закончыць праграму трэцяга кварталу не пазьней 22 верасьня. Гэта абавязацельства выконваецца з посьпехам. Прычым такія выпадкі не адзінкавыя.

Трэба адзначыць, што ступень удзелу камуністаў і камсамольцаў у разгортваньні спаборніцтва і ўдарніцтва непарыўна зьвязана з перабудовай па-новаму работы вытворчых партыйных і камсамольскіх калектываў і ячэек. На тымжа заводзе «Бальшавік» цэнтр цяжару партыйнай работы перанесен у ніжэйшае зьвяно вытворчасьці. Бюро партколегіяў і цэх'ячэек сыстэматычна заслухоўваюць справаздачы паасобных членаў партыі і парторгаў абавязкова з удзелам на бюро ўсёй партгрупы.

Удзел камуністаў у спаборніцтве і ўдарніцтве—неадлучная ўмова пасьпяховага выкананьня прамфінпляну.

Аднак, у радзе парткалектываў і ячэек гэтага яшчэ не зразумелі. Так, на многіх прадпрыемствах Віцебску ва ўдарніцкім руху прымаюць удзел толькі 50 проц. камуністаў і камсамольцаў. Ёсьць выпадкі недапушчальна фармальных адносін з боку паасобных парткалектываў і членаў партыі да ўдзелу ў спаборніцтве і ўдарніцтве камуністаў.

У радзе парткалектываў вельмі мала аддаецца ўвагі праверцы сакратароў, не праводзіцца ўлік работы паасобных ударнікаў-камуністаў. Такое становішча мае месца, напрыклад, на абутковай фабрыцы, што старшыня вытворчага сэктару гэтага прадпрыемства імкнецца вытлумачыць выключна недахватам сырцу.

Зараз партыйныя арганізацыі павінны асаблівую увагу зьвярнуць на пытаньне пераводу на гаспадарчы разрахунак вытворчых брыгад, якія, арганізуючы сваю работу на аснове ліквідацыі абезлічкі і ўраўнілаўкі, «павінны стаць асноўнай формай сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва».

Трэба рашуча перамагаць апартуністычную бязьдзейнасьць і нерашучасьць у гэтым напрамку. Досьвед брыгады цынкографаў (друкарня імя Сталіна), якая на аснове гаспадарчага разрахунку дабілася пазалічэньня выпрацоўкі прадукцыі на 80 проц., значнай эканоміі сырцу і невышэньня зарплаты, павінен быць перанесен на ўсе нашы фабрыкі і заводы.

На аснове брыгаднага гаспадарчага разрахунку і зьмешана-сустрэчнага пляну фабрыка «Камунарка» адолела вышэйшы з лыбокіх прарываў: раней прамфінплян на гэтым заводзе выконваўся толькі на 38 проц., а праз некалькі месяцаў прамфінплян ужо перавыконваўся.

На заводзе ёсьць штодзённы пераходны сьцяг, які кожны дзень перадаецца тэй брыгадзе, якая дасягнула лепшых паказальнікаў на вытворчасьці.

Разам з тым партыйныя арганізацыі павінны рашуча перамагаць імкненьні ў мэтах «гаспадарчай эфэктнасьці» ўводзіць матар'яльную няўстойку рабочых, што мае месца на некаторых нашых прадпрыемствах.

У сваёй пастанове нарада наметыла рад канкрэтных практычных мерапрыемстваў, выкананьне якіх павінна легчы ў аснову работы партыйных арганізацый.

Кожны камуніст на вытворчасьці павінен забясьпечыць разгортваньне індывідуальнага спаборніцтва ўнутры брыгад, павінен стаць у авангардзе барацьбітоў за колькасныя і асабліва якасныя паказальнікі нашай прамысловасьці, за рэалізацыю задач, указаных у прамове т. Сталіна.

К-р.

Віцебскі гарсавет зрывае будаўніцтва інтэрнатаў

ВІЦЕБСК, 16. (ПА ТЭЛЕГРАФУ АД НАШАГА СПЭЦ. КАР.).

ГАРСАВЕТ МАРУДЗІЦЬ З АДВОДАМ ЗЯМЕЛЬНЫХ ВУЧАСТКАЎ, ЧЫМ ПА СУТНАСЬЦІ ЗРЫВАЕ БУДАЎНІЦТВА БАРАЧНАГА ТЫПУ ІНТЭРНАТАЎ ДЛЯ СТУДЭНЦТВА. НАРКАМАСЬВЕТЫ СВА ЯЧАСОВА ПАСЛАЎ НАРАД НА ЛЕСАМАТАР'ЯЛЫ. АДНАК, ВЫЗНАЧАНЫ НА МЕСЦЫ ЛЕСАМАТАР'ЯЛ ДЛЯ БУДАЎНІЦТВА БАРАКАЎ НЕ ПАДЫХОДЗІЦЬ. КА МЕСЦЫ МОЖНА ЗНАЙСЬЦІ ЛЕПШЫ МАТАР'ЯЛ, АЛЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ БЕЛДЗЯРЖСНАБУ НЯ ЛІЧЫЦЬ БУДАЎНІЦТВА ІНТЭРНАТАЎ УДАРНЫМ. НЯ КІРУЕ ГЭТАЙ СПРАВАЙ ТАКСАМА І ІНСПЭКТАРЫЯТ НАРАСЬВЕТЫ.

ТАКІМ ЧЫНАМ, ВЯЛІКАЯ КОЛЬКАСЬЦЬ СТУДЭНЦТВА НЯ ЗМОЖА Ў ТЭРМІН ПАЧАЦЬ ЗАНЯТКАЎ. ГАРКОМ КП(б)Б, ГАРКК-РСІ ПАВІННЫ ПРЫНЯЦЬ ТЭРМІНОВЫЯ МЕРЫ.

ЗУЕВІЧ.

НОВАБУДОЎЛІ

КРЫЧАУСКІ ГІГАНТ ПУСЬЦІЦЬ У ТЭРМІН

ФАРСАВАЦЬ БУДАЎНІЦТВА ЭЛЕКТРЫЧНАЙ І ПОМПАВАЙ СТАНЦЫЙ ЦЭМЗАВОДУ—

БЕСЬПЕРАБОЙНАЕ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ БУДАМАТАР'ЯЛАМІ

Непарадкі, расхлябанасьць, адсутнасьць цьвёрдага кіраўніцтва ўсё яшчэ тармозяць будаўніцтва Крычаўскага цэмантнага заводу, які сваёй прадукцыяй паміжон з будучага году забясьпечваць усю пабудову БССР у цэманце.

На будоўлі разам з тым адчуваецца недахоп матар'ялаў—цэменту і арматурнага жалеза для жалеза-бетонных работ, лесаматар'ялаў—для цесьляроскіх работ і сартавога жалеза для фасоннага і сартавога жалеза, патрэбнага для работ, зьвязаных з мантажом. Адсутнасьць гэтых матар'ялаў стварае рэальную пагрозу зрыву своячасовага пуску заводу, бо са скамчэньнем будаўнічых работ зьвязана нармальнае вядзеньне мантажу.

Праўда, заводы, якім адведены заказы, ня выконваюць сваіх абавязацельстваў і гэтым тармозяць разгортваньне будоўлі. Але кіраўніцтва будаўніцтвам у лі. Але кіраўніцтва будаўніцтвам у асобе начальніка работ тав. Бэрхмана не змагло своячасова зьвязацца з арганізацыямі і прадпрыемствамі, каб дагаварыцца аб бесьперабойным забесьпячэньні будаўніцтва. Атэсты кіраўніцтва будаўніцтвам, выдаючыя, больш разьлічвалі на самацёк, на тое, што нарады бязумоўна дастануць метал, цэмант, лесаматар'ял і ўсё інш. Гэта сьцьвярджаецца тым, што калі сам т. Бэрхман зьвяртаўся на Бранскі завод, які забясьпечвае будаўніцтва цэментам, ён усё-ж дабіўся гарантыі ў дастаўцы цэменту пасьля месячнага перапынку. Сёньня пасьля значнага перапынку паступілі першыя два вагоны з ліку 22, дагаворных на верасень.

Тут належыць адзначыць, што прыбыўшыя раней два буша-каліберных вагоны цэменту аказаліся нягодным. Гэта выяўлена пробамі ўжо пасьля ўжываньня яго ў работах. Пашпарт на гэты цэмант Бранскі завод да гэтай пары ня прыслаў. Астатні цэмант у колькасьці каля 40 вагонаў павінен прыбыць у кастрычніку.

Самым слабым вучасткам будаўніцтва зьяўляецца электрастанцыя. Вучастак гэты вельмі адстаў з-за нераспарадчасьці прараба т. Катоміна, які зусім не цікавіцца лёсам усяго будаўніцтва. Гэтага прараба даўно трэба было-б зьняць, але ён усё-ж застаецца на будаўніцтве, вядучы свой вучастак «залоўнымі» тэмпамі і стварачы тым самым вялікі прарыў на ўсім фронце будаўніцтва заводу.

Значэньне электрастанцыі для пуску заводу асабліва падкрэсьліваць ня прыходзіцца, бо ясна, што без энэргіі завод ня пойдзе.

Ня пойдзе ён і без вады, бо ў асноўным працэс на заводзе пачынаецца з пераменьваньня крэйды з глінай у так званых «балтушках» (басэйны, дзе сырэц разбоўтваецца ў вадзе), для чаго неабходна ў вялікай колькасьці цёплая вада, якая ідзе зноў-такі ў апрацаваным выглядзе з электрастанцыі (пасьля харчаваньня катлоў).

Трэба сказаць, што будаўніцтва электрастанцыі тармозілася яшчэ і тым, што «Цэмпраект» увесь час затрымліваў пастаўку чарцяжоў, уносячы ў іх кожны раз зьмененьні. Так, напрыклад, зараз прыходзіцца ў шасьці мясцох выламваць вучасткі гатовай сьцяны, каб размясьціць бэтонныя слупы, зьвязаныя з устаноўкай катлоў.

Было горшае: адну ўжо гатовую сьцяну каля 150 кв. мэтраў, таўшчынёй у 1,5 цэглы, прышлося зусім выкінуць, бо яна была пастаўлена на балку, якая ня вытрымлівае такую нагрузку. Гэта зьявілася, праўда, жнівам памылкі ў разьліках; але зараз неабходна гэту сьцяну рабіць зноў (больш тонкую) і яна часткова затрымлівае мантаж на электрастанцыі.

Позьнае паступленьне чарцяжоў фундаманту пад турба-генэратар выклікала неабходнасьць весьці лішнія дапаможныя бэтонныя работы па агарожы фундаманту калён ад асыпаньня пры копцы катлавана пад упамянуты фундамант генэратара.

Зараз на вышыні сядзяць людзі і «клююць» (прабіваюць зубіламі дзіры) жалеза-бетонныя подкрэнавыя балкі, на якіх трэба пракласьці падкрэнавыя шлях электрастанцыі. Па гэтым шляху будзе рухацца магутны маставы кран, патрэбны пры мантажу, а ў далейшым пры рамонце на электрастанцыі. Гэтага можна было-б унікнуць, калі-б своячасова было указана пакажэньне дзіраў для ўмацаваньня рэек падкрэнаванага шляху. Усё гэта выклікае лішнія выдаткі, якія робяць больш даратым будаўніцтва.

Да будаўніцтва насоснай станцыі і водазаборнікаў, якія павінны забясьпечыць водой электрастанцыю, завод і рабочы пасёлак, толькі зараз прыступілі: капаюцца катлаваны. Гэта таксама вельмі адсталы вучастак будаўніцтва. Адстаў ён з-за позьняй прысылкі праекту. Праект прадугледжваў пабудову насоснай станцыі, запасных бакаў і водаапорнай вежы з жалеза-бетону. Недахват арматуры і цэменту штурхнуў кіраўніцтва заводу да замены жалеза-бетону цэглай (запасныя бакі мяркуецца апампаваць унутры цэраэітам). Прапанова гэта была паведамлена «Цэмпраекту» і апошні згадзіўся з ім. Зараз водаапорная вежа ўжо закладзена і пачата кладка сьцен з цэглы. Гэта будзе накшталт трубы вышынёй у 32 мэтры, на вярхушцы якой будзе знаходзіцца жалеза-бэтонны бак вялікай ёмкасьці.

З-за недахвату цэменту і арматурнага жалеза пабудова сілосаў (хаваньні для цэменту), фундаманты якіх амаль гатовы, перанесена на будучы год.

Калі затрымка ў скамчэньні будоўлі клінкернага складу ня можа моцна адбіцца на пуску заводу, бо клінкер у крайнім выпадку на першы час можа залоўвацца і без даху (дах усё-ж да моманту пуску заводу будзе гатоў), дык бяз поўнага скамчэньня будоўлі дымавых камэр заводу ня пусьціць. Фундамант пад дымавыя камеры зроблен. Да будаўніцтва саміх камэр, якія ўяўляюць з сябе вельмі складаную канструкцыю з балак, швелераў і агнеўпора, яшчэ ня прыступлена, ня гледзячы на тое, што чарцяжы прысланы месяц таму назад. Будоўля дымавых камэр патрабуе па меншай меры, чым двухзьменнай работе, двухмесячнага тэрміну. Тут сустрэліся з недахватам жалеза, агнеўпорнай цэглы і глины, а таксама чырвонай цэглы, якая патрабуецца ў колькасьці каля 275 тыс. штук. Пры поўнай забясьпечанасьці ў сілікатнай цэгле, будоўля адчувае дэфіцыт чырвонай цэглы. Своячасова не паклапаціліся загатовіць гэту цэглу і інш. матар'ялы для пабудовы адказнейшай часткі заводу—дымавых камэр.

Горш усяго тое, што Стальзбыт перадаверыў забесьпячэньне Крычаўскага заводу мэталам Белснабу. Гэта перадавер'е трэба, паводле думкі будаўнікоў і мантажнікаў, ліквідаваць, пакінуўшы забесьпячэньне будоўлі мэталам непасрэдна за Стальзбытам.

Кульнін.



Харкаўскі трактарабуд

На курсы рацыяналізатараў пасылаюць.... рацыяналізатараў

У выкананьне пастаноў партыі і ўраду аб узмацненьні рацыяналізатарскай кадрамі прамысловасьці БССР, ВСНГ адкрыў у Менску курсы па падрыхтоўцы рацыяналізатараў з ліку кваліфікаваных рабочых па наступных галінах прамысловасьці: мэталаапрацоўчай, тарфяной і будматар'ялаў.

Курсы павінны былі распачаць сваю працу 15-га жніўня г. г., але з прычыны ляндбайных і безадказных адносін з боку некаторых кіраўнікоў прадпрыемстваў да гэтай справы, набор на курсы яшчэ не закончан. Замест 75 чал. накіравана 57 чал. Ня гледзячы на распаўсюджаную абвешчаньняў, некаторыя прадпрыемствы ці зусім маўчаць, ці абмяжоўваюцца фармальным выкананьнем бюракратычнымі адпускамі.

Так, дырэктар Аршанскага райпрамкамбінату тав. Латушнёк піша: «у працаўнікі камбінату вучацца на курсы рацыяналізатараў няма каго».

Дырэктар Гомельскага кераміча-сілікатнага трасту таксама паведамляе, «на адным з трох цагельных заводаў ня знайшлося рабочых, якія-б жадалі паступіць на курсы».

Такі адказ атрымаў і ад Бабруйскага трасту мясцовай прамысловасьці.

Некаторыя-ж кіраўнікі (цагельны № 2 і 5, Віцебск) мусіць ня чыталі прапазіцыі прыёму і дадумаліся да больш цікавага: каб выканаць фармальна пастанову ВСНГЕ, яны прыслалі на курсы чабу таварышоў, якія ў красавіку 31 г. скончылі 6-цімесячныя курсы рацыяналізатараў у Маскве і маюць дастатковую падрыхтоўку для працы на заводзе.

Пара пакончыць з бюракратычнымі адносінамі да пытаньня падрыхтоўкі рацыяналізатарскіх кадраў для сацыялістычнай прамысловасьці.

Ал. Федэр.

МАЦАВАЦЬ РАБОЧАЕ ШЭФСТВА НАД ДЗЯРЖАПАРАТАМ

САЦЫЯЛІСТЫЧНЫМ НАМЕСЬНІКАМ— УВАГА І ШТОДЗЕННАЯ ДАПАМОГА

Сацыялістычнае сумяшчэньне—вышэйшая форма рабочага шэфства над дзяржапаратам—мае вялікае палітычнае і практычнае значэньне. Сацсумяшчэньне дае магчымасьць рабочым-шэфам выконваць рад адказных функцый у дзяржаўным апараце, праводзіць штодзенны кантроль над апаратам, не адрываючыся ад вытворчасьці.

Адозва ЦКК КП(б)Б і ЦСПСВ, апублікаваная ў ліпені г. г. гаворыць аб тым, што сацыялістычнае сумяшчэньне «рэалізуе адзін з важнейшых пунктаў праграмы нашай партыі аб неабходнасьці пагалоўнага прыцягненьня рабочых да непасрэднага ўдзелу ў кіраўніцтве дзяржавай. Гэтым самым мы ажыцьцяўляем дармовае выкананьне кожным працоўным дзяржаўных абавязкаў пасьля 8 гадзін працы на вытворчасьці».

Прэзыдыум ЦКК УсесКП(б) у сваёй пастанове выразна падкрэсьліў вялізарнае значэньне сацсумяшчэньня і прызнаў недаацэнку рабочага шэфства адным з відаў апартунізму на практыцы.

Аднак, дагэтуль рад савецкіх органаў, заводзкіх, партыйных і прафэсыянальных арганізацый яўна недаацэньваюць значэньня сацыялістычнага сумяшчэньня і наогул шэфскай работы.

Выканаць дырэктывы аб шэфскай рабоце

Матар'ялы, якія мы сёньня друкуем, яскрава сьведчаць аб гэтым.

Менскі гарадзкі савет на працягу 4 месяцаў не аддаў ніякай увагі праверцы сваёй пастановы, вынесенай яшчэ ў маі, аб вылучэньні 30 сацнамесьнікаў у радзе гарадзкіх устаноў. Аддзелы гарсавету ня ведаюць, хто зьяўляецца іх шэфам. У Дзяржпляне адказныя выканаўцы, да якіх прымацаваны сацнамесьнікі, не правялі з апошнімі ніякай работы.

У Магілеве ніякіх інструкцыйных нарад і курсаў з сацнамесьнікамі не праводзілася.

Друкарня імя Сталіна (Менск) вылучыла ў якасьці сацнамесьнікаў работнікаў, перагружаных на вытворчасьці.

Буйнейшыя магілеўскія прадпрыемствы вылучылі толькі па адным намесьніку. Фабком Магілеўскай швейнай фабрыкі ня ведае нават прозьвішча вылучанага сацнамесьніка.

Праўленьне Менскага ЦРК да апошняга часу зусім не займалася пытаньнем сацсумяшчэньня.

Ліпеньскі пленум ЦКК КП(б)Б пастанавіў павесьці бязьлітасную барацьбу з апартуністычнай недаацэнкай шэфства і сацыялістычнага сумяшчэньня. Гэта дырэктыва пленуму павінна быць поўнасьцю выканана.

Неабходна дабіцца рашучага пералому ў пытаньні сацсумяшчэньня і шэфскай работы. Усе арганізацыі павінны лічыць шэфскую работу адной з сваіх важнейшых задач.

Ніякай работы з вылучанцамі не вядзецца

Праўленьне МЦРК апартуністычна недаацэньвае шэфства рабочых над дзяржапаратам. Ніякай работы з вылучанымі ў якасьці сацнамесьнікаў рабочымі абутковай фабрыкі да апошняга часу не вялося.

Толькі 14 верасьня праўленьне ўпяршыню занялося гэтым пытаньнем, раней «ня было часу для гэтай справы». Толькі зараз вылучан член праўленьня, адказны за работу з сацнамесьнікамі. Апошнія разьмеркаваны па сэктарох. З 16 сацнамесьнікаў да работы прыступіла толькі чатыры. Ніхто ня цікавіцца прычынамі іх няўдзелу на работу.

Н—н.

Менскі гарсавет недаацэньвае рабочага шэфства

Яшчэ 9 мая прэзыдыум гарсавету вызначаў каля 30 пасад для сацнамесьнікаў: у гарфа, камгас, інспэкцыях асьветы, аховы здароўя, працы, сацзыху і г. д. З таго часу прайшло каля 4 месяцаў, а сацнамесьнікі дагэтуль не прыступілі да работы. Больш таго, аддзелы інспэкцыі гарсавету ня цікавяцца тым, да якіх прадпрыемстваў яны прымацаваны, хто вылучан сацнамесьнікамі.

Работнікі гарадзкога савету не аддаюць увагі рабочаму шэфству. Ніхто не адказвае за гэту работу, ніхто не займаецца пытаньнем сацсумяшчэньня. Парт'ячэйка і мясцком нічога не зрабілі, каб наладзіць шэфскую работу.

Прэзыдыум гарадзкога савету не заняўся праверкай выкананьня сваёй пастановы ад 9 мая аб вылучэньні сацнамесьнікаў і фактычна інгнорує шэфства над дзяржапаратам.

Такога становішча далей цярпець нельга. Прэзыдыум гарсавету павінен выканаць дырэктыву ЦКК УсесКП(б) аб шэфскай рабоце.

Я.

11 сацнамесьнікаў—на ўвесь горад

МАГІЛЕЎ. Праверка работы па шэфстве над дзяржапаратам, праведзеная Магілеўскай РКК-РСІ, выявіла, што прадпрыемствы вылучылі ўсяго 11 сацнамесьнікаў, якія працуюць у розных аддзелах гарсавету.

У ЦРК, райкапгассаюзе і радзе іншых устаноў сацнамесьнікаў зусім няма. Такія буйныя прадпрыемствы, як завод імя Сталіна, «Адраджэньне», шоўкавая фабрыка вылучалі толькі па адным сацнамесьніку.

Апошнія сябе цалкам апраўдалі: яны аддаюць рабоце ў апараце ўвесь вольны час, увайшлі ў курс справы, самастойна замяняюць кіраўнікоў устаноў у іх выхадныя дні, але партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі шэфствуючых прадпрыемстваў ня кіруюць работай сацнамесьнікаў.

Цікавы факт: фабком швейнай фабрыкі ня ведае нават прозьвішча рабочага, вылучанага ў сацнамесьнікі. Ніякіх інструкцыйных нарад і курсаў з сацнамесьнікамі не праводзілася.

Н.

„Я НЯ МАЮ ЧАСУ З ВАМІ ГУТАРЫЦЬ"

Друкарня імя Сталіна, якая зьяўляецца шэфам Дзяржпляну, вылучыла 11 сацнамесьнікаў. Для іх былі створаны пяцідзённыя курсы па азнаямленьні са структурай і функцыямі Дзяржпляну. Сацнамесьнікі былі прымацаваны да іх па працы не зьяўляліся і курсаў не наведвала.

Справа ў тым, што фабком друкарні вылучыў у якасьці сацнамесьнікаў... загадчыка цэху, старшыню цэхпрафкому і іншых таварышоў, якія маюць вялікую нагрузку на прадпрыемстве. У выніку сацнамесьнікі ня мелі магчымасьці працаваць у Дзяржпляне і зьяўляліся там рэдкімі гасьцямі.

Замест таго, каб вызваліць сацнамесьнікаў ад нагрузак, фабком гэтымі днямі адклікаў іх з работы Дзяржпляну, замяніўшы іх другімі.

Некаторыя работнікі Дзяржпляну бюракратычна адносяцца да сацнамесьнікаў. Калі рабочы тав. Курлянд зьвярнуўся да адказнага выканаўца па камунальна-жыльлёвых пытаньнях тав. Вядро з запытаньнем адносна сваёй працы, той адказаў: «У 4 гадзіны я канчаю работу і ня маю часу з вамі гутарыць».

Дагэтуль адказныя выканаўцы, да якіх прымацаваны сацнамесьнікі, яшчэ не склалі плянаў работы з апошнімі. Усё гэта перашкаджае нармальнай працы і грамадзкія арганізацыі Дзяржпляну павінны неадкладна пазьбавіцца тварам да шэфства над дзяржапаратам, забясьпечыць сацнамесьнікам максымальна спрыяючыя ўмовы работы.

З. Р.

КАНФЭРЭНЦЫЯ ПА ЯКАСЬЦІ ПРАДУКЦЫІ У ВІЦЕБСКУ

У нізкай якасьці прадукцыі вінаваты абязьлічка і ўраўнілаўка

Скончыла сваю работу канфэрэнцыя віцебскіх ударнікаў, прысьвечаная якасьці абутку. На канфэрэнцыю зьявілася каля 400 рабочых ударнікаў.

Прадстаўнік Белскураб'яднаньня таварыш Яечка каротка інфармаваў аб становішчы беларускай скуранай прамысловасьці. Таксама былі заслуханы інфармацыі двух буйных прадпрыемстваў гор. Віцебску: скуразаводу і абутковай фабрыкі «Лекерта». Прадстаўнікі гэтых прадпрыемстваў спасылаліся на аб'ектыўныя прычыны, недахоп сырцу і г. д., не давалі сапраўднага малюнку свайго прадпрыемства. Між тым прадсавнік ВКО адзначыў, што сырэц ёсьць, але патрэбна гібкасьць у працы. Дырэктар скуразаводу тав. Гефэн імкнуўся звалідь віну на абутковую фабрыку за дрэнную якасьць прадукцыі і адначасова заявіў, што на скуразаводзе ўсё 2 нарадку.

Дэлегаты рабоч

РЭАЛІЗУЕМ АДОЗВУ ЦК І СНК АБ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ

13.000 сьвінаматак—саўгасам «Сьвінаводу»

Пасылкай саўгасных брыгад у раёны загатовак, штодзённым кантролем і дапамогай аддзяленьням Белмяса перадавыя саўгасы дабіліся выкананьня пляну

Сорак тысяч сьвінаматак—баявая праграма камплектаваньня саўгасаў Сьвінаводу. 1 кастрычніка апошні тэрмін.

На 10 верасьня плян камплектаваньня быў выкананы толькі **на 62 проц.** На працягу трох дэкад саўгасы Сьвінаводу павінны атрымаць 13.000 сьвінаматак ад аддзяленьняў Белмяса і 4.000 сьвінаматак з выгадаванага ў саміх-жа саўгасах маладняка.

Пасьля таго, як саўгасы атрымалі падэкадны апэрацыйны плян камплектаваньня і па пункты Белмяса выехалі спэцыяльныя саўгасныя брыгады, ход укамплектаваньня значна пасунуўся ўперад. Калі ў чэрвені саўгасы атрымалі ад Белмяса 700 сьвінаматак, дык ліпень даў ужо 2.100, жнівень 3.000, а з 20 жніўня па 10 верасьня **5.000 сьвінаматак.**

9 саўгасаў: **Мсьціж, Сьвіспач, Варонічы, Вайніпы, Лучыца, Скрыншчына, Крывое, Разэльмова і Высокае** ўжо выканалі і перавыканалі пляны камплектаваньня.

Прыклад гэтых саўгасаў паказвае, што пры належнай актыўнасьці і запікаўленасьці самога саўгаснага калектыву камплектаваньне стада можа быць выканана ў зусім кароткія тэрміны. Гэтыя саўгасы не чакалі пакуль аддзяленьні Белмяса ім накіруюць сьвінаматак. Яны самі вылучылі спэцыяльныя брыгады, якія выехалі ў раёны загатовак і штодзённа дапамагалі аддзяленьням Белмяса.

Але значная частка саўгасаў праяўляе пасыўнасьць у гэтай важнейшай справе. Так, саўгас **Вялень-Сінча** ўкамплектаваны ўсяго на 42 проц., у той-жа час ад Белмяса паступіла толькі **12 проц.** вызначаных паводле пляну сьвінаматак. Саўгас імя Сталіна ўкамплектаван на 45 проц., а ад Белмяса атрымалі толькі 25 проц. належачых ім сьвінаматак. Яшчэ горш у саўгасе **Боркі-Бялевічы,** які ўкамплектаван на 50 проц., а ад Белмяса ня прыняў ні аднэй сьвінаматкі.

Дырэкцыі і рабочкомы гэтых саўгасаў праяўляюць поўную бязьдзейнасьць і незадзікаўленасьць ва ўкамплектаваньні. Яны спадзяюцца выключна на самацёк, што сьвіней ім нехта прывязе ў саўгас. Гэтыя саўгасы зусім не дапамагаюць аддзяленьням Белмяса ў фарсаваньні загатовак сьвіней.

Саюзным Наркамземам была дана зусім ясная дырэктыва, каб у першую чаргу за кошт загатовак камплектаваліся саўгасы. Але рад райкаапсаюзаў парушае гэту дырэктыву. Напрыклад, **Чырвона-Слабодзкі і Пухавіцкі** райкаапсаюзы ў першую чаргу накіроўваюць загатоўленых сьвіней у калгасы.

Да выкананьня пляну камплектаваньня застаўся зусім кароткі тэрмін. Саўгасы павінны разгарнуць сапраўды бальшавіцкія тэмпы работы. Ад ролі пасыўных гледачоў саўгасы павінны перайсьці да актыўных дапаможнікаў аддзяленьняў Белмяса, пасылаючы свае спэцыяльныя брыгады на першапачатковыя пункты загатовак. Толькі пры гэтых умовах саўгасы **своячасова выканаюць дырэктывы партыі і ўраду аб камплектаваньні стада.**

Дагэтуль пытаньнямі якасьці стада ў саўгасах мала цікавіліся. Зараз праводзіцца генэральны агляд усяго стада, прычым вылучаецца найбольш прадукцыйная група сьвінаматак з тым, каб з будучага году мала прадукцыйныя сьвіньні былі заменены прыплодам ад лепшых сьвінаматак. Такімі мэтадамі за параўнаўча кароткі тэрмін саўгасы здолеюць палепшыць жаласьць свайго стада.

Для правядзеньня гэтай работы ў саўгасы выехалі 60 студэнтаў сьвіналодчага тэхнікуму. Але рад саўгасаў, як Некрашы, Брэнчыцы, Будзённавец да гэтай важнейшай справы падышлі чыста фармальна і зьвялі ўсю работу толькі да выбракоўкі, а не вывучэньня і паляпшэньня стада.

Адначасова праводзіцца і адбор кныроў.

Трэба падкрэсьліць, што пасьпяховае правядзеньне гэтай адказнейшай задачы патрабуе ўвагі ўсяго калектыву саўгасаў і грамадзкіх арганізацый.

Між тым у радзе саўгасаў, як **Блонь, Вялень, Вішнёўка** отрод рабочых зусім не вядзецца амаль ніякай масавай растлумачальнай работы. Грамадзкія арганізацыі гэтых саўгасаў яшчэ не павярнуліся тварам да вытворчасьці, не забясьпечваюць кіраўніцтва важнейшымі гаспадарча-палітычнымі мерапрыемствамі ў саўгасах.

Толькі пыракім ўкараненьнем тэхнікі сьвінагадоўлі, азнаямленьнем з яе ўсёй масы рабочых калектывам мы здолеем у найкарацейшы тэрмін выканаць адказнейшую задачу, пастаўленую партыяй у галіне разгортваньня сацыялістычнай жывёлагадоўлі.



На фэрме калгасу «Маяк»

„Згубілі“ дырэктыву

КРУПКІ. (Наш кар.). У Крупскім раёне адозва партыі і ўраду аб жывёлагадоўлі не даведена да шырокіх мас калгасьнікаў і рабочых саўгасаў. Бюро райкому абмежавалася толькі тым, што адзін раз разглядала пытаньне аб жывёлагадоўлі, дало рад дырэктыў і ўсё.

Ніхто не прасачыў за тым, каб гэтыя дырэктывы былі выкананы.

У раёне зараз ёсьць 9 сьвінагадоўчых калгасных фэрм і 10 малочных фэрм з пагалоўем у 846 сьвінаматак і 632 кароўвы. Але колькі ў сапраўднасьці павінна быць у гэтых фэрмах — ніхто ня ведае. Заданьне Наркамзему аб разгортваньні жывёлагадоўлі згубілася ў нетрах калцыярыі райза. У выніку ў раёне зараз ніхто ня ведае, наколькі выкананы пляны камплектаваньня, будаўніцтва і г. д.

АЛІМОР.

АСЕНЬНЯ-ЗІМОВЫЯ ПЕРАВОЗКІ

НА МАГІЛЕЎСКІМ ВУЗЬЛЕ прыстанцыйныя склады заваленыгрузамі

РАЗГРУЗКА НЕАРГАНІЗАВАНА

МАГІЛЕЎ. Падрыхтоўка Магілеўскага вузла да асеньня-зімовых перавозак праходзіць ня зусім здавальняюча. Станцыённыя пылкі завалены шлакам, сьмецьцём. Прыстанцыённыя склады і пакгаўзы завалены грузамі. Для іх разгрузкі і падрыхтоўкі да асеньня - зімовых перавозак нічога ня робіцца. Кіраўніцтва станцыі не праяўляе гібкасьці і распарадчасьці. Па віне райкаапсаюзу пляцформа з сельска-гаспадарчымі машынамі прастаяла на станцыі каля 10 сутак. (БЕЛТА).

Грузы выгружаць на таварнай станцыі

БАБРУЙСК. На Бабруйскім чыгуначным вузле 2 станцыі—Бярэзіна-таварная і станцыя Бабруйск-пасажырская. Але ўсе грузы чамусьці звычайна адрасуюцца на станц. Бабруйск, тады, калі гэты груз трэба выгружаць на **таварнай станцыі Бярэзіна.** Па гэтай прычыне кожны дзень вагоны з грузамі робяць па 8-10 клм. непатрэбных прабегаў і прастояў. **(Белта).**

Цягнікі павінны адпраўляцца па раскладу

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Прагулы на Віцебскім вузле растуць. За 2 дэкады жніўня па няўважлівых прычынах было 350 прагульных дзён. Па гэтай прычыне крывая сьлезтаваньня цягнікоў па раскладу ўсё падае ўніз. У жніўні толькі 61 проц. цягнікоў адпраўлена па раскладу. Павялічваецца лік здарэньняў. Патрэбны рашучыя меры для аздараўленьня работы на Віцебскім вузле.

А. З.

Дэпо Асіповічы выходзіць з прарыву

ЖЛОБІН. Зрывы спаранай язды на 6-м эксплёатацыйным раёне далёка не ліквідаваны. Вымернікі, якія дырэкцыяй дарогі, ня выконваюцца. Яшчэ няма сапраўднай барацьбы за зьмішчэньне абязьлічкі ня толькі ў парэзовым парку, але і ва ўсіх астатніх зьвеньнях транспарту, што зьяўляецца вялікім тормазам у выкананьні плянаў асеньня-зімовых перавозак.

За апошні час дэпо **Асіповічы,** якое дагэтуль ганебна адставала ў выкананьні вымернікаў, пачало выходзіць з прарыву і ў адносінах выкананьня заданьня па спаранай язьдзе заняло першае месца ў Жлобінскім раёне. (БЕЛТА).

Да 25 верасьня убраць канаплі

Пастанова ЦКК БССР

Вызначаныя Наркамземам БССР тэрміны ўборкі і абмалоту канапель сарваны. Цераблeньне канапель трэба было скончыць да 10 верасьня, а абмалот павінен быў быць праведзены да 15 верасьня на 85 проц. У сапраўднасьці на 15 верасьня па калгасным і аднаасобным сэктарох выцераблена 24,4 проц. і абмалочана 4,3 проц. Апошняя пяцідзённка ня дала амаль ніякага прыросту выцераблeнай плошчы. Па становішчы на 10 верасьня было выцераблена 20,2%, а па становішчы на 15 верасьня — 24,4%.

Зрыў вызначаных Наркамземам БССР тэрмінаў уборкі, абмалоту і мочкі канапель ставіць пад пагрозу давядзеньне ўсяго ўраджаю саломы да трасты ўвосень 1931 г., у сувязі з чым ствараецца небясьпека своячасовай здачы гатовай таварнай прадукцыі — пянькі.

Прарыў, які вызначыўся ва ўборцы, абмалоце і мочцы канапель тлумачыцца адсутнасьцю належнай увагі да гэтай культуры з боку райза і райкалгассаюзу.

У мэтах ліквідацыі прарыву, калегія Наркамзему БССР прапануе райза ўзяць пад асобны нагляд ход уборкі і апрацоўкі канапель, забясьпечыўшы канвэрны спосаб уборкі і апрацоўкі.

Прапанаваць райза і райкалгассаюзам камандыраваць сваіх працаўнікоў у калгасы са значнымі пасевамі канапель для арганізацыі безадкладнай уборкі, абмалоту і мочкі канапель.

Прапанаваць райза і райкалгассаюзам забясьпечыць СКАНЧЭНЬНЕ ЦЕРАБЛЕНЬНЯ КАНАПЕЛЬ ДА 25 ВЕРАСЬНЯ, АБМАЛОТУ — ДА 30 ВЕРАСЬНЯ І ЗАМОЧКІ — ДА 5 КАСТРЫЧНІКА.

Загадчыкам Касьцюковіцкага, Кармянскага, Чырвонапольскага і Чавускага райза за непрадстаўленьне вестак аб ходзе ўборкі і апрацоўкі канапель спачатку кампаніі да 15 верасьня, паставіць на від.

Прапанаваць усім райза ў тэлеграфнай пяцідзённай справаздачнасьці прадстаўляць весткі аб колькасьці ў гэктарах замочанай, або разасланай поскані.

НА РЫШТАВАНЬНЯХ ІЛЬНАЗАВОДАЎ

БУДАЎНІКІ МСЬЦІСЛАЎСКАГА ІЛЬНАЗАВОДУ падрыхтавалі карпусы да мантажу НА 45 ДЗЕН РАНЕЙ ТЭРМІНУ

Забясьпечыць датэрміновы пуск ільназаводу

АМСЬЦІСЛАЎЕ. Амсьціслаўскі ільназавод павінен быць пушчан 1 студзеня 1932 г. Паводле пляну будынкі павінны быць падрыхтаваны да мантажу не пазьней 15 лістапада. Будаўнічы калектыў рабочых ільназаводу ў свой час даў абяцаньне праз «Зьвязду» падрыхтаваць завод да мантажу не пазьней 1 кастрычніка. Гэта абяцаньне ўжо амаль выканана. Вытворчы корпус ільназаводу адбудован на 86 проц. Фундаманты пад мялкі і швінк-турбіны—закладзены. Падлога ў вытворчым корпусе зроблена. Зараз праводзіцца ашчэпленьне корпусу.

Белільнаканоплябуду і адміністрацыі праводзіцца **забясьпечыць датэрміновы пуск Амсьціслаўскага ільназаводу.**

Рабочыя будаўніцтва ўступілі ў сацыялістычнае спаборніцтва з будаўнікамі Чавускага ільназаводу. Будаўнікі Чавускага ільназаводу павінны ўзмацніць тэмпы будаўніцтва, якія значна адстаюць ад тэмпаў будаўніцтва Амсьціслаўскага ільназаводу.

На звышударным будаўніцтве—няма ўдарных тэмпаў

КРУПКІ. Крупскі ільназавод належыць да звышударнай групы ільназаводаў, якія павінны быць пушчаны 20 верасьня. Будаўніцтва галоўнага корпусу заводу выканана на 92 проц., усіх іншых будынкаў на 94 проц. Мантажныя работы яшчэ не распачаты. Лёкамабіль, прызначаны для ільназаводу яшчэ знаходзіцца ў дарозе на ст. Смалявічы МВБ чыг. Як Белільнаканоплябуд, так і адміністрацыя будаўніцтва заводу, ня прынялі належных мер да своячасовай дастаўкі лёкамабілю. Неабходна прыняць усе меры, каб лёкамабіль быў у бліжэйшыя-ж дні дастаўлен на станцыю Крупкі і неадкладна перавезены на будаўніцтва ільназаводу. Яшчэ і на сённешні дзень ня поўнасьцю атрымана трансьмісійнае абсталяваньне, кастратоўкі і іншыя машыны.

Чашніцкаму будаўніцтву—будматар'ялы

ЧАШНІКІ. (Наш кар.). Чашніцкі ільназавод павінен быць пушчан да 1 лістапада. Аднак, многія раённыя арганізацыі ня ўлічваюць гэтага і ў сваёй рабоце стараюць перашкоды для пасьпяховага заканчэньня будаўніцтва ільназаводу.

Райкалгассаюз ня выканаў заданьня па забясьпячэньні рабочай сілай будаўніцтва. Заводу не хапае 8 цесьляроў.

Сацспаборніцтва і ўдарніцтва засталося на паперы. Ніякай праверкі дагаворў на сацспаборніцтва не праводзілася. Адміністрацыя заводу недаацэньвае палітычнае значэньне сацспаборніцтва і сваімі адносінамі зрывае яго.

Кепска наладжана забясьпячэньне заводу будаўнічымі матар'ялямі з мясцовых рэсурсаў. З боку Чашніцкага вучлеспрамгасу праяўлены безадказныя і ганебныя адносіны ў забясьпячэньні лесматар'ялямі ільназаводу. На будаўніцтва прыслана 60 бярвёньняў, якія зусім непрыгодны і валяцца без скарыстаньня.

Міхневіч.

Калі будзе швінктурбіна?

БОРКАВІЧЫ. На Воркавіцкім ільназаводзе заканчваецца ўстаноўка лёкамабіля. Разгортваньне мантажных работ затрымліваецца з-за адсутнасьці трансьмісійнага абсталяваньня. Недахват будаўнічых матар'ялаў, цьвікоў і толі затрымлівае сканчэньне будаўнічых работ.

Праўленьне ільнаканоплябудтрасту яшчэ ў красавіку паведаміла кіраўніцтва пабудовы аб высьлыцы з Клімаўскага машына-будаўнічага заводу швінк - турбіны. Аднак у апошнія дні высьветлілася, што швінк-турбіну для ільназаводу Клімаўскі завод ня выслаў.

Кіраўніцтва пабудовай поўнасьцю не забясьпечыла правільнай арганізацыі работ, што таксама адбіваецца на ходзе будаўніцтва заводу.

Затрыманьне сканчэньня будаўніцтва адбіваецца на своячасовай апрацоўцы прадукцыі Воркавіцкага ільназаводу і калгасаў раёну.

Полацкія раённыя арганізацыі павінны забясьпечыць сапраўднае кіраўніцтва ходам пабудовы Воркавіцкага ільназаводу.

Неадкладна наладзіць рабочае забесьпячэньне

ВЕТРЫНА. Ільназавод прызначаны да пуску да 1 кастрычніка. Аднак, сённешнія тэмпы будаўніцтва не гарантуюць своячасовага пуску заводу. Выкананa толькі 51 проц. будаўнічага пляну. Адміністрацыя заводу ня ўжыла належных мер, каб забясьпечыць будаўніцтва рабочай сілай за лік адыходнікаў з вакольных калгасаў. Рабочае забесьпячэньне пастаўлена зусім дрэнна. Нормы выдачы цайка ня выконваюцца. Як выніх — вялікая цякучасьць рабочай сілы на будаўніцтве. Полацкія раённыя арганізацыі Ветрынскаму ільназаводу не аддаюць ніякай увагі. Неабходна зараз-жа наладзіць рабочае забесьпячэньне рабочых будаўніцтва.

Віцебскі чыгуначны раён зрывае вываз ільнапрадукцыі

ЛЁЗНА. Дзякуючы энтузіязму рабочых Лёзьнянскі ільназавод выканаў жнівеньскі прамфінплян на **105,2 проц.**

Зараз уся апрацаваная прадукцыя ў колькасьці 9-ці вагонаў на працягу доўгага часу ляжыць бяз руху на складах. Адміністрацыя чыгункі па-бюракратычнаму адносіцца да запатрабаваньняў заводу аб прадастаўленьні таварных вагонаў для перавозкі прадукцыі. У выніку зрываецца выкананьне нарадаў па адпраўцы прадукцыі для тэкстыльнай прамысловасьці.

Дырэкцыяй заводу была своячасова падана заяўка на таварныя вагоны, але чамусьці Віцебскі 6-ты эксплёатацыйны раён чыгункі ня ўключыў у свой плян прадастаўленьня заводу вагонаў.

Мы патрабуем неадкладнага забесьпячэньня заводу вагонамі для адпраўкі прадукцыі.

ШАПУРОЎ.

„Усё роўна нам прэміі не атрымаць“...

Палітычная блізарукасьць смалявіцкага райкалгассаюзу

СМАЛЯВІЧЫ. (Ад нашага спадкора). У Смалявіцкім жывёлагадоўчым раёне гэтым годзе павінны быць арганізаваны 20 малочных фэрм, 30 сьвінагадоўчых і 10 цялячых. Гэта ў плянах.

У сапраўднасьці-ж у раёне пакуль арганізавана 17 малочных фэрм, якія ўкамплектаваны толькі на 34 проц., па сьвінаводчых фэрмах пляны камплектаваньня выкананы ўсяго на 15 проц., а па цялячых яшчэ менш.

Неадавальняюча і здача таварнай прадукцыі — па малаку плян выканан **на 20 проц.,** па сьвіньнях **на 3 проц.**

Важнейшыя дырэктывы партыі і ўраду аб жывёлагадоўлі не знайшлі адбітку ў практычнай рабоце смалявіцкіх земальна-калгасных арганізацый. Ужо месяц, як абвешчан усебеларускі конкурс на лепшыя калгасныя таварныя фэрмы, а ў Смалявічах нават і ня думаюць уключацца ў конкурс.

— Куды нам уключацца, усё роўна нам прэміі не атрымаць,—вось адказ кіраўнікоў райкалгассаюзу.

Палітычная блізарукасьць райкалгассаюзу прывяла да таго, што конкурс **не скарыстоўваецца, як стымул для разгортваньня жывёлагадоўлі ў раёне.**

Паміж райкаапсаюзам і райсаюзам спажывецкай кааперацыі за апошні час вядзецца шкодная канкурэнцыя. Райсаюз шляхом выдачы большых прэмій імкнецца атрымаць больш таварнай прадукцыі ад жывёлагадоўчых калгасаў. У выніку калгасы трымаюць у сябе таварную прадукцыю і чакаюць хто ім больш дасьць прэміі. А калі няма прэміі—зусім нічога не здаюць. Так, калгас **«Новае жыцьцё»** здае толькі 40 проц. таварнага малака, 60 проц. застаецца ў калгасе. Такое становішча і ў радзе іншых калгасаў.

Заўважваецца, што агенты райкаапсаюзу імкнуцца выканаць плян мясазагатовак па раёне за кошт выбракоўкі кароў у малочных фэрмах, прычым часта **бракуюць і цельных кароў.** Нядаўна без ведама ўнаўважанага Белмалакоцэнтру па Смалявіцкім раёне **выбракавана на мяса з калгасу «Рабочы» 17 кароў, з калгасу «Культура» 7 кароў.**

Мы патрабуем, **КАБ ВІНАВАТЫЯ Ў ВЫБРАКОЎЦЫ САПРАЎДЫ МАЛОЧНЫХ ПРАДУКЦЫЙНЫХ КАРОЎ БЫЛІ ЗАРАЗ-ЖА ПРЫЦЯГНУТЫ ДА СУДОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ.**

Смалявіцкія раённыя арганізацыі павінны, нарэшце, павярнуцца тварам да жывёлагадоўлі.

Арцельны.

БЕЛЫЯ НЯВОЛЬНІЦЫ

Сяляне Заходняй Беларусі масамі ўцякаюць з «культурнай» панскай Польшчы ў «барбарскі» і «галодны» Савецкі Саюз. Цэлымі ўзброенымі групамі, рызыкуючы сваім жыцьцём, пераходзяць яны савецка-польскую мяжу. Пераходзяць з жонкамі і дзецьмі, пераходзяць іншы раз з усім сваім здабыткам. Многія гінуць пад вінтовачным абстрэлам, або пад кулямётным агнём польскіх пагранічнікаў. Многіх ловяць, садзяць у турмы... Але гэта не дапамагае. Сяляне ўсё ідуць і ідуць, рызыкуючы загінуць пад кулямі польскіх пагранжандараў, уцякаюць з беларускага «рая» ў «пекла» бальшавікоў.

Чаго толькі ня выдумляла беларуская прэса, каб па-свойму «вытлумачыць» гэту цягу сялян у краіну Савецкаў, гэта ўцяканьне іх з-пад абсаца маршала Пілсудскага. Тут і «бальшавіцкія агенты», якія нібыццам спакушаюць сялян на пераход граніцы, абяцаючы ім вялікія горы недзе на Урале. Тут і цэлыя «вярбовачныя бюро» камуністаў, што арганізуюць перабежкі ў краіну Саветаў, раздаюць налева і направа сялянам «на дарожныя выдаткі» сотні рублёў. Не абышлося, відома, і без агентаў ДПУ — гэтых вечных казлоў адпушчэньня ўсіх антысавецкіх кампаній як беларускай, так і іншых капіталістычных краін газэт і часопісяй.

Але ўсе гэтыя выдумкі аказаліся (як і трэба было чакаць) сшытымі занадта ўжо белымі ніткамі. Ім ня верылі і ня вераць ня толькі працоўныя масы Польшчы. Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Ім ня верыць, або толькі робіць выгляд, што верыць і польская інтэлігенцыя, ім ня вераць нават тыя, хто шчыра адданы рэжыму пана Пілсудскага.

Дый як-жа можна верыць падобным нябылицам, падобным недарэчнасьцям? Паводле іх пісаньняў у Савецкім Саюзе голад, прымусовая праца, там гвалтам сялян зганяюць у калгасы... А сяляне Заходняй Беларусі масамі ўцякаюць у гэты Савецкі Саюз, а сяляне Заходняй Беларусі толькі і марыць аб тым, як-бы выратавацца ад прыгожасьцяй беларускай культуры. Ёсьць тут ад чаго згубіць галаву, ёсьць тут ад чаго і беларускім журналістам збіцца з тону, заблытацца ва ўласнай хлусьні.

Адна з віленскіх фашысцкіх газэт, бачачы, што ні «маскоўскім агентам», ні «вярбовачнымі бюро» нельга выратаваць становішча, нельга вытлумачыць уцяканьня сялян праз савецка-польскую мяжу ў гэты самы «страшны» Савецкі Саюз — прыдумала такое «тлумачэньне». У Польшчы лютуе зараз эканамічны крызіс, там людзі галоднымі сядзяць у дарэмным чаканьні хоць якога-небудзь заработку, хоць якой-небудзь працы. Дык вось па думцы віленскага беларускага журналіста сяляне Заходняй Беларусі ўцякаюць у Савецкі Саюз толькі таму, што ў Польшчы, моў, беспрацоўе. А ў Францыі (куды да самага апошняга часу галодныя рабочыя і работніцы Польшчы масамі эміграваллі) — у Францыі, моў, і сваіх беспрацоўных даволі, у Францыі цяпер не адчуваюць патрэбы ў польскіх працоўных эмігрантах. Значыцца па думцы беларускай віленскай газэты выходзіць, што сяляне Заходняй Беларусі і Польшчы ўцякаюць у Савецкі Саюз таму, што ім закрыт зараз французкі «рай», што для іх зараз часова закрыта магчымасьць эміграцыі ў краіну Пуанкарэ, Бонкураў і Брыянаў.

Мы са здавальненьнем адзначаем гэта, праўда вымушанае, прызнаньне віленскай газэты, што фашысцкі рэжым пана Пілсудскага ня ў стане больш забясьпечыць сродкамі існаваньня працоўныя масы сваёй краіны, што грамадзяне польскай буржуазнай рэспублікі вымушаны шукаць сабе сродкі для пражыцьця за межамі фашысцкай Польшчы. Гэта нам, зразумела, было ўжо даўно вядома, але ўсё-ж такі прызнаньне саміх арганізатараў белага тэрору і голаду мае і для нас сваю каштоўнасьць.

Што-ж датычыцца французкага «рая», які, са спыненьнем эміграцыі ў Францыю, нібыта страцілі польскія працаўнікі — дык вось апісаньню «райскага» жыцьця польскіх працоўных эмігрантаў (галоўным чынам польскіх батрачак) у Францыі мы якраз і прысьвечваем гэты нарыс.

Пасьля сканчэньня імпэрыялістычнай вайны 1914—1918 году ў Францыі зьявілася асабліва моцная **патрэба ў рабочай сіле** — галоўным чынам патрэба ў **чужаземных рабочых.** Прычын гэтаму (як эканамічных, так і палітычных) было многа. У гэтым нашым артыкуле мы закранём толькі галоўнейшыя з іх, толькі адзначым іх, не займаючыся іх характарыстыкай.

Імпэрыялістычная вайна **вельмі абяскровіла французкі пралетарыят і сялянства. Мільён пяцьсот тысяч людзей у цьвеце сіл, галоўным чынам, з радоў пралетарыяту і сялянства, лягло на палях баёў.** Многа соцень тысяч з іх вярнулася дадому калекамі, ніздольнымі, або ў значнай меры менш здольнымі, чым раней, да прадукцыйнай працы.

З другога боку рэканструкцыя зруйнаваных вайной паўночных індустрыяльных раёнаў Францыі і пазьнейшае моцнае разьвіцьцё (ў значнай меры дзякуючы нямецкім рэпарацыям і інфляцыі французкага франка) французкай як цяжкай, так і лёгкай індустрыі, патрабавалі **асабліва многа здаровай рабочай сілы і, у інтарэсах капіталістаў, магчыма больш таннай.**

Усе гэтыя прычыны прымусілі буржуазію Францыі пасьля імпэрыялістычнай вайны асабліва моцна разьвіць, практыкаваную і да вайны масавую эміграцыю ў Францыю чужаземных рабочых: **палякаў, італьянцаў, гішпанцаў, чэха-славакаў** і шмат іншых. Французскаму капіталісту была выгадна такая эміграцыя, па-першае, таму, што іх чужаземным рабочым праца аплачвалася значна ніжэй, чым рабочым французкай нацыянальнасьці, па-другое, дзякуючы канкурэнцыі чужаземных рабочых фабрыкантам і заводчыкам было лягчэй зьмяншаць зарплату і французкага рабочага, па-трэцяе, маса чужаземных рабочых, пазбаўленых усіх палітычных правоў ва Францыі, значна **зьмяншала палітычную баяздольнасьць і французкага пралетарыяту.** Капіталісты, дзякуючы наяўнасьці ў іх рэзэрва з адарваных ад сваёй краіны, ня ведаючых французкай мовы, пазбаўленых усіх палітычных правоў чужаземных рабочых — капіталістам было значна лягчэй маніпураваць і змагацца супроць французкага пралетарыяту, супроць яго законных як палітычных, так і эканамічных патрабаваньняў.

Асабліва многа з першых дзён пасьля сканчэньня імпэрыялістычнай вайны і да самага апошняга часу эмігравала ў Францыю **польскіх рабочых і работніц.** Цэлыя населішчы іх раскіданы па ўсіх раёнах поўначы і поўдня Францыі.

У адным з бліжэйшых нашых артыкулаў мы раскажам чытачом «Зьвязды» аб цяжкім жыцьці гэтых польскіх працоўных эмігрантаў у вугальных капальнях Францыі, аб эксплёатацыі іх французкімі капіталістамі, аб палітычным і рэлігійным апараце, з дапамогай якіх трымаюць гэтых эмігрантаў далёка ад палітыкі, далёка ад рабочых рэвалюцыйных арганізацый.

Сёньня-ж паглядзім, як жыве і працуе польская батрачка на фэрмах і на вінаградніках Францыі, што знаходзіць яна ў эміграцыі.

Гнаныя голадам, белым тэрорам, беспрацоўем (у Польшчы больш ці менш перманэнтна існуючым) рабочыя, сяляне і сялянкі Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны лёгка трапляюць у **сеці вярбоўшчыкаў,** якія па даручэньні розных капіталістычных арганізацый **набіраюць рабочую сілу для Францыі.**

Падпісаўшы звычайна гадавы кантракт, эмігранты з Варшавы і з іншых раёнаў Польшчы накіроўваюцца ў Францыю. Там, зараз-жа пасьля прыезду іх рассылаюць па месцы работы на фабрыкі і на заводы, у вугальныя капальні, на фэрмы і на вінаградныя плянтацыі.

Цікава адзначыць, што польскі працоўны эмігрант, які прыехаў у Францыю па кантракту, звычайна **не атрымлівае ў Францыі адпаведных папер, якія-б давалі яму права на свабоднае пражываньне ў межах Францыі.** Такім чынам, у працягу ўсёй сваёй работы па кантракту ў прадпрыемцы гэты польскі працоўны эмігрант зьвязан па руках і па нагах, ён знаходзіцца цалкам ва ўладзе фабрыканта ці фэрмэра, які выпісаў яго з Польшчы. Калі фабрыкант ці фэрмэр **нездаволен** сваім польскім рабочым або польскай работніцай, калі ён заўважыў, што гэты эмігрант, скажам, **палітычна «неблагаднадзейны»,** ён яго разьлічвае з работы яшчэ да сканчэньня тэрміну кантракту, паведамляючы аб гэтым у бліжэйшае **паліцэйскае кіраўніцтва.** А з прычыны таго, што ў гэтага рабочага або работніцы няма асабістага права на пражываньне ў Францыі, дык іх неадкладна ў 48 гадзін **высылаюць з межаў французкай рэспублікі.** Можна сабе ўявіць, якое пры такім становішчы шырокае поле дасьцца наймальніку для эксплёатацыі закантрактаванага ім рабочага і работніцы.

Калі-ж канчаецца тэрмін кантракту, дык перад польскім працоўным эмігрантам ставіцца такая дылема: **або аднавіць яшчэ свой кантракт на год ці на два, або... вярнуцца ў Польшчу на холад і на голад.**

***

І вось польскія работніцы прыбылі да закантрактаўшага іх памешчыка. Якія-ж умовы іх работы і маёнтку, колькі яны там за сваю работу атрымліваюць?

Работніца павінна пачынаць сваю работу з **чатырох гадзін раніцы** (дойка кароў). Да шасьці гадзін раніцы ўсе каровы павінны быць выдаены, малако працэджана і разьліта ў бідоны. У шэсьць гадзін раніцы работніцы выганяюць кароў у поле, чысьцяць стойлы і птушнікі. Потым кароткі перапынак на сьнеданьне і зноў на работы ў поле да дванаццаці гадзін.

Пасьля **абеду** мыцьцё начыньня, уборка пакояў, зноў работа ў полі да самага вечару. Вечарам трэба падрыхтаваць вячэру для рабочых, зноў памыць усё начыньне, зноў дагледзець кароў і птушак, накармліць іх... Такім чынам, устаючы раніцой у чатыры гадзіны, работніца кладзецца спаць не раней адзінаццаці гадзін вечара. А гэта выходзіць **быць на нагах 19 гадзін у сутні,** з якіх **мінімум 15 гадзін праводзіцца** за цяжкой, стамляючай працай. [1])

Па нядзелях афіцыяльна работы ў маёнтку працягваюцца да першай гадзіны дня. Але вечарам работніца ўсё-ж такі павінна і падаіць кароў (8-10 кароў на адну работніцу) і загнаць іх у стойлы, і накармліць іх. Так што фактычна **яна і па нядзелях** (дзень адпачынку ў Францыі) **занята на рабоце амаль што столькі-ж часу, колькі і ў звычайны рабочы дзень.**

Колькі-ж зарабляе ў месяц батрачка на французкай фэрме, у маёнтку буйнога французкага капіталіста? Батрачка **французкай** нацыянальнасьці — максымум **200 франкаў** (20 рублёў) у месяц; батрачка - чужаземка (у тым ліку і польская батрачка) — максымум **130-150 франкаў (13-15 рублёў) у месяц за тую-ж, а часамі і больш цяжкую работу,** чым іх французскія таварышкі. Значыцца польская работніца на французкай фэрме зарабляе ў дзень (пры 15-ці гадзінах цяжкай працы) **ад трох да пяці франкаў** (ад 30 да 50 капеек), значыцца гадзіна яе працы расцэньваецца там на 20-40 санціміаў (па 2-4 капейкі на нашы грошы).

[1]) «Юманітэ» ад 17 жніўня 1931 г.

Праўда, у кантракце сказана, што памешчык абавязваецца карміць і паіць сваіх работніц, абавязваецца даць ім памяшканьне для жыцьця. Але корміць ён іх так «добра», што калі-б работніца не дакупляла-б за свае мізэрныя грошы сабе прадуктаў, дык яна ўжо даўно-б памерла з голаду. Што датычыцца да «памяшканьня для жыцьця», дык аб выкананьні і гэтага пункту кантракту памешчык мала клапоціцца. Работніцы яго жывуць дзе папала: у раскіданым хляве, у гумне на сене, на кухонных лаўках, або ў калідорах.

А памешчык, а яго сыны, якія на лета прыяжджаюць з Парыжу, а гаспадары фэрм і іх адказныя прыказчыкі ходзяць вакол маладых эмігрантак у пошуках галянтных авантур, у пошуках вельмі танных для іх здавальненьняў.

Што можа зрабіць, што можа ўжыць для сваёй абароны супроць агідных прычэпак усемагутнага гаспадара польская батрачка? Адзінокая, зьвязаная эксплёататарскім кантрактам, ня ведаючая французкай мовы, закінутая на чужыну...

На ўсім прасторы поўдня Францыі—у раёне **Марсэлю, у Прэвансе, у Ангельскіх горах, вакол Ніццы, Кан, Монако і Монтэ-Карло,** на бязьмежных прасторах, знаходзяцца багатыя **вінаградныя плянтацыі** французскіх памешчыкаў, буйных французскіх фэрмэраў, французскіх кулакоў.

Вось, напрыклад, вёска Карэстанг аднаго з гэтых раёнаў. Тут трыццаць буйных уласьнікаў вінаградніка, маюць кожны ад пяці да дзесяці тысяч гэкталітраў віна кожны год. Яны прадаюць гэкталітр віна ў сярэднім па 150 франкаў (па 15 рублёў). Падлічаця колькі мільёнаў франкаў прыбытку ў год атрымліваюць гэтыя ўласьнікі на поўдні Францыі?

А вось нейкі пан Гну. У мінулым годзе ён прадаў ураджай свайго віна за **1.700.000** франкаў, г. зн. за **170.000** руб. на нашы грошы. [1]) Цэлы маёнтак, здабыты толькі за адзін ураджай яго вінаграднікаў.

І вось, уласьнікі вінаградных латыфундый самым жорсткім чынам эксплёатуюць сваіх батракоў і батрачак, плоцяць ім за збор вінаграду і за выраб віна літаральна грашы. Батраку-спэцыялісту на вырабе віна яны плоцяць 32 франкі 50 санціміаў за 12-гадзінны рабочы дзень (3 руб. 25 кап.), батрачыць, якая зразае вінаградныя лозы—19 франкаў таксама за 12-гадзінны рабочы дзень (1 руб. 90 кап.). І гэта, відома, на ўсім сваім.

Гэта, французскім рабочым і работніцам. Што-ж датычыцца чужаземцаў (у прыватнасьці польскіх батракоў і батрачак), дык іх заробак на вінаградніках яшчэ вельмі значна ніжэй чым у іх французскіх таварышоў пры выкананьні аднэй і тэй-жа работы. Батрак чужаземец тут ледзь-ледзь зарабляе ў дзень 20-25 франкаў (2 руб.—2 р. 50 к.), батрачка-чужаземка рэдка калі зарабляе больш 10-15 франкаў (1 руб.—1 руб. 50 кап.). І гэта, відома, таксама за **12-гадзінны рабочы дзень,** таксама на ўсім сваім.

Калі мы прымем пад увагу, што работ

Год выданьня—XV
№ 252 (4167)
Панядзелак 21 верасьня 1931
Цана экзэмпляра 5 кап.
ВЫХОДЗІЦЬ БЕСЬПЕРАПЫННА

Зьвязда

Орган ЦК і МК. Гарскому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА
МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 65.
Тэлефоны
рэдактар—4-27,—сакратар—10-74, намгстэк тар—13-80, прадсяд. ЧК 3-80, сак. земл.—6-19, масл. інфарм.—6-19, дзяжн. інфарм.—5-[illegible], начны рэдактар—6-12, [illegible] народнай інфармацыі—10-[illegible], [illegible]

МЕНСКІЯ ПРАЛЕТАРЫ патрабуюць ад гарсавету НЕАДКЛАДНА ВЫКАНАЦЬ наказ выбаршчыкаў

З ГНЁЗДАЎ ЦЕМРЫ ЗРАБІЦЬ АЧАГІ КУЛЬТУРЫ

Мы, рабочыя і служачыя МТПО супольна з рабочымі саўгасу «Санджаны» цалкам і поўнасьцю ўсьвядомілі, што рэлігійныя дамы існуюць выключна для пакрыцьця контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці і змоў супроць савецкай улады. Мы катэгарычна патрабуем ад гарсавету, каб найхутчай адабраць 10 сынагог, сабор і касьцёл па Савецкай вул. пад культурныя ўстановы рабочых.

***

Рабочыя заводу «Камунар» катэгарычна патрабуюць ад Менгарсавету перадачы будынку касьцёлу па Савецкай вул. пад рабочы клюб, бо гэты будынак служыць рассадзінкам рэлігійнага дурману і месцам прыязьдзеньня працы, накіраванай супроць сацыялістычнага будаўніцтва.

Мы патрабуем ад Менгарсавету больш шпаркіх тэмпаў у справе ўзмацненьня культурнага будаўніцтва і найхутчэйшага выкананьня нашага патрабаваньня.

Далоў рэлігійны дурман!

***

Агульны сход калектыву рабочых і служачых ЦК, гаркому, зубалячэбніцы, пячэбніцы-стацыянару, сталоўкі і цырульні «Чырвонага Крыжу», адзначае, што для пасьпяховага разгортваньня сеткі навучальных і культурных устаноў адчуваецца вялікі недахват памяшканьняў, у той час, калі ў Менску пустуюць вялізарныя будынкі рэлігійнага культу: сынагогі, цэрквы і касьцёлы.

Гарсавет да апошняга часу ня выканаў дапага яму наказу аб адваяваньні гэтых будынкаў пад культурныя ўстановы.

Сход катэгарычна патрабуе ад гарсавету забраць па гор. Менску 10 сынагог, касьцёл па Савецкай вул. і сабор на пляцы Волі пад культурныя і навучальныя ўстановы.

***

Агульны сход супрацоўнікаў Белсельдзяржснабу ў ліку 60 чалавек патрабуе ад гарсавету безадкладнага закрыцьця касьцёлу па Савецкай вул., сабору на пляцы Волі і сынагог, якія патрэбна скарыстаць пад культурныя ўстановы.

Малітвенныя дамы, цэрквы і касьцёлы повінны быць скарыстаны пад клюбы, ясьлі, школы і інтэрнаты.

З дамоў «страху перад богам»—у дамы культуры і навукі.

***

Агульны сход супрацоўнікаў Плодагароднины, улічваючы, што працоўныя г. Менску ня маюць пад культурныя ўстановы памяшканьняў, дзе можна было-б праводзіць культурную работу, у той час, калі ў горадзе пустуе шмат цэркваў, касьцёлаў і сынагог — патрабуе ад гарсавету перадачы часткі апошніх пад культурныя ўстановы.

***

Клясава чужыя элементы: кулацтва, папы, рабіны, ксяндзы, бачачы сваю пагібель, усімі мерамі стараюцца падарваць наша будаўніцтва і групуюцца вакол цэркваў, касьцёлаў і сынагог, дзе вядуць сваю контр-рэвалюцыйную работу.

Мы рабочыя, цагельнага заводу № 1, абгаварыўшы гэта пытаньне на мітынгу патрабуем ад гарсавету, каб сабор, 10 сынагог і касьцёл па Савецкай вул. перадаць пад культурныя ўстановы.

***

Рэлігія заўсёды зьяўлялася ў руках клясы эксплёататараў зброяй уціску, цемры, няволі шырокіх працоўных мас, і ў часе клясавых баёў пралетарыяту з буржуазіяй, цэрквы, сынагогі і касьцёлы зьяўляліся і зьяўляюцца гнёздамі контр-рэвалюцыйнай работы і агітацыі.

Агульны сход супрацоўнікаў БДУ патрабуе ад гарадзкога савету перадачы касьцёлаў, цэркваў і сынагог — гэтых ачагоў дурману, пад культурна-асьветныя ўстановы.

Мы рабочыя і служачыя, ў колькасьці 87 чал. V будаўнічага раёну МБВ чыгункі, патрабуем ад Менгарсавету адабраць цэрквы, касьцёлы, сынагогі і іншыя рэлігійныя будынкі і перадаць іх пад культурныя ўстановы, школы і клюбы.

***

У той час, калі адчуваецца вялікі недахват жыльлёвага фонду, рад дамоў знаходзіцца ў карыстаньні пад цэрквамі, сынагогамі і касьцёламі, якія ў сучасны момант пустуюць.

Лічачы гэткае становішча недапушчальным, агульны сход калектываў НКЗамежгандлю, Экспартлесу і Пушнасындыкату патрабуе ад гарсавету выканаць наказ у адносінах павялічэньня культурных устаноў і зьніжчыць расаднікі, якія дурманяць масы, як-та: касьцёлы, сынагогі, цэрквы і перадаць іх для скарыстаньня пад культурна-выхаваўчыя ўстановы.

***

З усіх прадпрыемстваў і ўстаноў гор. Менску прыбываюць шматлікія катэгарычныя патрабаваньні аб адабраньні 10 сынагог, сабору і касьцёлу па Савецкай, якія пустуюць і аб перадачы іх пад культурныя ўстановы.

Падобныя патрабаваньні атрыманы таксама ад РАБОЧЫХ СЛУЖБЫ ЭКСПЛЁАТАЦЫІ ЎСЯГО ВУЗЛА, АД РАБОЧЫХ 4-га АКАЛОТКУ МБВ, АД СУПРАЦОЎНІКАЎ БЕЛАРУСКАГА АДДЗЯЛЕНЬНЯ «САЮЗСКУРЫ», АД СУПРАЦОЎНІКАЎ БЕЛАРУСКАГА АДДЗЯЛЕНЬНЯ «САЮЗКУРЫ», АД СУПРАЦОЎНІКАЎ «УЭА», АД РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ ГАРЖЫЛСАЮЗУ, АД СУПРАЦОЎНІКАЎ МЦРК, СУПРАЦОЎНІКАЎ НДІ, 3-й ФАБРЫЧНА-ЗАВОДСКАЙ СЯМІГОДКІ І ІНШ.

НОВАЕ ЗЛАЧЫНСТВА польскага фашызму

У Горадні ўначы вывезьлі на могілкі целы чатырох замучаных палітзьняволеных
У Беластоку памёрла ў шпіталі трое закатаваных палітзьняволеных

ВАРШАВА, 19. Учора дайшла да нас страшная навіна, што галадоўка ў Гарадзенскай турме скончылася тым, што ўначы было вывезена на могілкі ЧАТЫРЫ ТРУПЫ ЗАМУЧАНЫХ ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫХ.

ДАВІД СКУЛЬЧЫК, які сядзеў у турме за тое, што належаў да камуністычнай партыі быў задушаны ў часе так званага штучнага кармленьня, якое заключаецца ў тым, што палітзьняволеным адчыняюць гвалтам рот і ўводзяць у горла мэталёвую трубку, праз якую ўліваюць ежу. МАРЧУКУ пакалечылі і скрывілі гартань, што выклікала крывацёк з горла. Тры астатнія палітзьняволеныя памёрлі гэтымі днямі ў шпіталі.

На працягу апошніх трох месяцаў памёрла ў лазарэце тры палітзьняволеныя—ВОЗЬНЯК, ГАНІЧ і ДЗЕМКОВІЧ.

Сярод палітзьняволеных БЕЛАСТОКУ ёсьць шмат цяжка хворых на сухоты, якія харкаюць крывёю. Яны застаюцца бяз усякай дапамогі доктара ў адных памяшканьнях са здаровымі. У лазарэт зьняволеных забіраюць за некалькі дзён да сьмерці.

ГАНЬБА КАТАМ! ГОНАР ПАМЯЦІ ЗАМУЧАНЫХ БАРАЦЬБІТОЎ РЭВАЛЮЦЫІ!

ПРАТЭСТЫ І ШЫРОКАЯ ДАПАМОГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ І ПРАЦОЎНЫХ МАС УСЯГО СЬВЕТУ КЯХАЙ БУДУЦЬ АДКАЗАМ НА ЗЛАЧЫНСТВЫ КАТАЎ!

Кратка

26-га верасьня адбудзецца запаменьне месяцу.

У гор. Сарагосе (Гішпанія) адбылася сутычка рабочых з паліцыяй. Забіты адзін рабочы і паранена чатыры.

У Баўгарыі ў мінулым годзе засталіся без работы тысячы настаўнікаў пачатковых школ. У гэтым навучальным годзе лік беспрацоўных вырас да 2.000.

Дзяржаўны дэфіцыт Японіі ў гэтым годзе складае каля 60 млн. іен. (Іена—95 кап.).

У выніку рэпрэсый прадпрыньтых Чылійскім ураламі пры задушэньні паўстаньня маракоў налічваецца больш тысячы забітых і некалькі соцень параненых.

Да 2 год турмы прыгаворана 19-ці гадовая работніца Гебэрн у Лодзі (Польшча). Гебэрн абвінавачваецца ў распаўсюджваньні камуністычнай літаратуры.

19 марак (марка—48 кап.) у тыдзень — такая сярэдняя заробная плата нямецкага тэкстыльшчыка.

Эстонская эскадра прыбыла ў Гель сінфорс (сталіца Фінляндыі).

Разгромлены харчовыя магазыны беспрацоўнымі ў Бэрліне.

Аднавіліся ваенныя дзеяньні паміж паўстанцамі і ангельскімі вайскамі ў Бірме (частка Індыі). Ідуць жорсткія баі.

Прысуджаны да пакараньня сьмерцю 10 кіраўнікоў нядаўняга паўстаньня ў ваенным флёце ў Чылі (у паўдзённай Амэрыцы).

Адна з найбольшых паравозных фірм у Бэрліне «Борсіг» знаходзіцца ў стадыі банкрутства. Некалькім тысячам рабочых пагражае беспрацоўе. («Ротэ фанэ»).

У той час, калі ў Нямеччыне мільёны рабочых галадаюць, нямецкая буржуазія траціць 2 мільёны марак на цэркаў. («Ротэ фанэ»).

За апошнія дні забаронены ўрадам на 4 тыдні эсноўныя камуністычныя газэты ў Нямеччыне. Прычынай для забароны паліцыя выкарыстала тэлеграму ЦК КПГ, да паўстаўшых ангельскіх маракоў, падрукаваную ў гэтых газэтах.

Лік зарэгістраваных беспрацоўных у Англіі на 7 верасьня павялічыўся за тыдзень на 38.412 чал. і складае 2.800.631 чалавек супроць 2.139.571 чал. на тое-ж чысло ў мінулым годзе.

Ангельская біржа рэагавала на хваляваньні ў флёце рэзкім падзеньнем ангельскіх паперу.

Па ўсёй Нямеччыне і асабліва ў Бэрліне рэзка павысілася сьмяротнасьць. У Бэрліне за першыя тры месяцы 1930 году сьмяротных выпадкі на 1.825 перавысілі нараджэньні, а за гэты-ж пэрыяд 1931 г. сьмяротных выпадкаў — на 4.064 больш, чым нараджэньняў.

Правадыр арабскіх паўстанцаў Омар Альмухтар, які змагаўся ў апошнія гады з італьянскімі акупацыйнымі войскамі, узяты імі ў палон і павешаны.

„Усеагульнае" навучаньне ў Польшчы

ВАРШАВА, 18. ДА ПАЧАТКУ НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ Ў ПОЛЬШЧЫ, ВЫСЬВЕТЛІЛАСЯ, ШТО Ў СУВЯЗІ З СКАРАЧЭНЬНЕМ КРЭДЫТАЎ, ЗАКРЫЦЬЦЬМ ШКОЛ І Г. Д., КАЛЯ 1 МЛН. ДЗЯЦЕЙ, НЯ ГЛЕДЗЯЧЫ НА ЗАКОН АБ УСЕАГУЛЬНЫМ АБАВЯЗКОВЫМ НАВУЧАНЬНІ, ЗАСТАЛІСЯ ПА-ЗА ШКОЛАМІ.

„НІ АДНАГО ЦЭНТНЭРА ЗБОЖЖА ПРЫВАТНІКУ"

Адзначым манэўры часьцей РСЧА крутым уздымам тэмпаў збожжазагатовак

На прыемачным пункце (Менск) р[illegible]

ПОСЬПЕХІ ЖЛОБІНШЧЫНЫ

ЖЛОБІН.

У выніку шырока разгорнутай масавай работы вакол загатовак збожжа і сена, дасягнуты значныя посьпехі на гэтым важнейшым вучастку сацыялістычнага будаўніцтва. Гадавы плян сеназагатовак на 15 верасьня перавыкананы на 5,6 проц. Гадавы плян збожжазагатовак выкананы на 22 проц. Загатоўкі ідуць далей.

ПАД ПАГРОЗАЙ ЗРЫВУ

АСІПОВІЧЫ.

Збожжазагатоўкі па Асіповіцкім раёне праходзяць вельмі дрэнна. Жнівеньскае заданьне было выкананае ўсяго на 10 проц. Першая пяцідзёнка верасьня таксама не дала належнага аруху.

Райкаатсаюз зусім не падрыхтаваўся да правядзеньня збожжазагатоўчай кампаніі. Цьвёрдыя заданьні кулацка-заможным гаспадаркам ня ўсюды яшчэ даны. Давядзеньне пляну да вёскі і калгасаў таксама яшчэ ня скончана.

Кіруючыя раённыя арганізацыі амаль зусім не аддаюць увагі збожжазагатоўкам. У выніку, кампанія па раёне—пад пагрозай зрыву. Трэба пакласьці канец апартуністычнай бязьдзейнасьці раённых загатоўчых арганізацый і дабіцца карэннага пералому ў ходзе збожжазагатовак.

ТОЛЬКІ 9,1 ПРОЦ. ГАДАВОГА ПЛЯНУ

ГЛУСК.

Гадавы плян збожжазагатовак па Глускім раёне на 10 верасьня выкананы на 9,1 проц. Калгасы выканалі 26 проц. заданьня, аднаасобныя сэктар—4,2 проц.

Злачынна марудна ідзе спагнаньне збожжа з кулацка-заможных гаспадарак па цьвёрдых заданьнях. На 10 верасьня спагнана ўсяго 8,5 проц. пляну. Гэта—вынік апартуністычнай бязьдзейнасьці раду партыйных ячэек і сельсаветаў і простага патураньня кулацтву.

Наперадзе па збожжазагатоўках ідуць наступныя сельсаветы: МАКАВІЦКІ (19 проц. гадавога пляну), КЛЕТНЯНСКІ (17,9 проц.), ГАРАДОЦКІ (17,6 проц.).

Ганебна плятуцца ў хвасьце: КАРПІЛАЎСКІ сельсавет (0,1 проц.), ЗАГАЛЬСКІ (1,2 проц.), КАЗУЛІЦКІ (2,7 проц.), ГАЦКІ (4 проц.), СЛАБА-ГЕРАМАНАЎСКІ (5 проц.) і інш.

300 фурманак чакалі 12 гадзін

СЛУЦАК.

11 ВЕРАСЬНЯ НА СТ. СЛУЦАК САБРАЛОСЯ ЗВЫШ 300 ФУРМАНАК ЗДАТЧЫКАЎ БУЛЬБЫ. АДНАК, ЗАГАТОЎЧЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ НЯ БЫЛІ ПАДРЫХТАВАНЫ ДА ПРЫЁМУ БУЛЬБЫ. СПАДЗЯЮЧЫСЯ НА ТОЕ, ШТО БУЛЬБА АДРАЗУ БУДЗЕ ПАГРУЖАНА Ў ВАГОНЫ, СЛУЦКІ СПАЖЫЎСАЮЗ НЕ ПАКЛАПАЦІЎСЯ АБ АДКРЫЦЬЦІ СКЛАДАЎ І ПРЫЁМНЫХ ПУНКТАЎ. МІЖ ТЫМ, ЧЫГУНКА АКА ЗАЛАСЯ ЗУСІМ НЕПАДРЫХТАВАНАЙ ДА ПАГРУЗКІ БУЛЬБЫ. УСЯГО НА СТАНЦЫІ БЫЛО... 5 ВАГОНАЎ І ТЫЯ НЕ РАЗТРУЖАНЫЯ. НАЧАЛЬНІК СТАНЦЫІ БЕЗДАПАМОЖНА ПАЦІСКАЎ ПЛЯЧЫМА І ЗВАЛЬВАЎ УСЮ ВІНУ НА ЖЛОБІНСКІ ВУЗЕЛ, ЯКІ, МОЎ, НЕ ДАСЛАЎ ВАГОНАЎ.

У ВЫНІКУ ГЭТАЙ АГІДНАЙ ЦЯГАНІНЫ ЗДАТЧЫКАМ БУЛЬБЫ ПРЫЙШЛОСЯ ЧАКАЦЬ ПРЫЁМУ КАЛЯ 12 ГАДЗІН.

БУЛЬБА Ў СЛУЦАК ПАСТУПАЕ З 4-Х ВАКОЛЧНЫХ РАЁНАЎ, АЛЕ ПЛЯНАВАГА КАЛЯНДАРНАГА ПЛЯНУ ПАСТУПЛЕНЬНЯ БУЛЬБЫ З РАЁНАЎ НЯМА.

АБ КУЛЬТУРНЫМ АБСЛУГОЎВАНЬНІ ЗДАТЧЫКАЎ БУЛЬБЫ НІХТО НЕ КЛАПОЦІЦЦА. ГЭТЫМ КАРЫСТАЕЦЦА КУЛАЦКА-ЗАМОЖНАЯ ЧАСТКА, ЯКАЯ ВЯДЗЕ СВАЮ «ВЫХАВАЎЧУЮ» РАБОТУ СЯРОД БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ.

БРЫГАДЗІР «ЗЬВЯЗДЫ» П. Н.

Усім праўленьням калгасаў і калгассаюзаў

На аснове правільнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, ў рашучай барацьбе з кулацтвам, дасягнуты вялізарнейшыя посьпехі на фронце калектывізацыі. Калгасы ў пэрыяд вясновай пасеўнай і ўборачнай кампаніі да біліся раду буйнейшых дасягненьняў і паказалі поўную перавагу над дробнай аднаасобнай гаспадаркай. Калгасы павінны паказаць прыклады бальшавіцкіх тэмпаў і ў здачы (продажу) дзяржаве таварнай прадукцыі, своечасова і поўнасьцю выканаўшы плыны загатовак.

Рад калгасаў паказаў ужо бліскучы прыклад, выканаўшы і перавыканаўшы дэтэрміновае свае гадавыя пляны збожжазагатовак (калгасы ШКЛОЎШЧЫНЫ выканалі 166 проц. гадавога заданьня, паасобныя калгасы Жлобінскага раёну і інш. таксама перавыканалі заданьні).

Аднак, значная частка калгасаў, нават цэлых раёнаў, ня ўключылася яшчэ ў збожжазагатоўкі. (калгасы ЛАГОЙСКАГА, ЗАСЛАЎСКАГА, ЧАВУСКАГА І СУРАЖСКАГА раёнаў).

Калгассаюзы і праўленьні калгасаў павінны рашучай барацьбой з апартуністычнай установкай на «чарговасьць кампаніі», з адкладваньнем малацьбы на восень і зіму, на канец скончэньня ўборкі і сэўбы, правільнай і дасканалай арганізацыяй працы з поўнай увагай з усімі работамі па ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі, бездакладна арганізаваць абмалот збожжавых і заблясьпечыць поўнае выкананьне плянаў збожжазагатовак.

Пад пэўнгам «ніводнага кілё збожжа прыватніку» дайце рашучы адпор кулацкім настроям затрымаць лішні збожжа ня агрэмаджанага, гэтак і неагрэмаджанага ўраджаю пад усялякі повадамі.

Калгасы павінны забясьпечыць высокую якасьць здаванага збожжа па чыстаце, сухасьці, аднатыповасьці. Гэтым самым падвысіце каштоўнасьць яго і стойкасьць пры хаваньні.

Тав. калгасьнікі, мабілізуйце ў сябе мяхі для перавозкі збожжа, шырокім настроям затрымаць лішні збожжа ня агрэмаджанага, гэтак і неагрэмаджанага ўраджаю пад усялякі повадамі.

Калгасы павінны забясьпечыць высокую якасьць здаванага збожжа па чыстаце, сухасьці, аднатыповасьці. Гэтым самым падвысіце каштоўнасьць яго і стойкасьць пры хаваньні.

Тав. калгасьнікі, мабілізуйце ў сябе мяхі для перавозкі збожжа, шырокага выкарыстоўвайце спосабы бэзтэрмін перавозкі (скрынкі, лантухі і інш.)—гэта ка выкарыстоўвайце спосабы бэзтэрмін перавозкі (скрынкі, лантухі і інш.)—гэта забясьпечыць бесьперабойны вывад збожжа на ссыпункты.

Калгассаюзы павінны да 25 верасьня правесьці зьпяты прадстаўнікоў тых калгасаў, якія добра арганізавалі здачу (продаж) таварнага збожжа для пераняцьця вопыту іх работы у іншыя калгасы.

У парадку самазабавязацельства, на падставе шырокага разгортваньня сацыспаборніцтва, ударніцтва і мэтаду сустрэчных плянаў па арганізацыі абмалоту і датэрміновым выкананьні плянаў збожжазагатовак, калгасы павінны ўзяць вядучую ролю ў здачы лішкаў збожжа з тым, каб поўнасьцю выканаць пляны збожжазагатовак да «Дня ўраджаю і калектывізацыі».

Старшыня праўленьня Калгасцэнтру БССР С. МІЦЬКОЎ.

ПОЎНАЯ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦЬ

СЛУЦАК. (Наш кар.).

Збожжазагатоўчая кампанія па Случчыне не разгарнулася яшчэ належнымі тэмпамі. Раённыя арганізацыі і сельсаветы давялі цьвёрдыя заданьні да кулацка-заможных гаспадарак і... на гэтым супакоіліся. Кантроль за выкананьнем цьвёрдых заданьняў не наладжан. Загатоўчыя органы чакаюць пакуль... кулакі самі прывязуць збожжа. Зразумела, што кулацтва карыстаецца «спакойствам» загатоўцаў і ўсямерна імпануе здачу збожжа дзяржаве.

Масавая работа вакол збожжазагатовак не разгорнута. Пляны здачы збожжа не абгаворваны на сходах сялян і ня прыняты ў парадку самазабавязацельстваў. У выніку бязьдзейнасьці загатоўчых органаў гадавы плян збожжазагатовак выкананы толькі на 7,2 проц.

Рад сельсаветаў дагэтуль яшчэ ня здалі ніводнага кілё збожжа. Да гэтых сельсаветаў адносяцца: Старэўскі, Дарасінскі, Грэскі і інш.

Парт'ячэйкі на мясцох невыстарчальна кіруюць збожжазагатоўчай кампаніяй. Такія буйнейшыя ячэйкі, як Урэцкая і інш., стаяць зусім у баку ад кампаніі.

Райспажыўсаюз, райза і райкалгасаюз мала цікавяцца збожжазагатоўкамі і амаль зусім ня кіруюць гэтай справай.

У паасобных сельсаветах (Цараўскі, Казяпоўцкі і інш.) маюць месца антысярэдняцкія загібы. У гэтых сельсаветах цьвёрдыя заданьні даведзены да значнай часткі бядняцка-сярэдняцкіх гаспадарак. Гэтыя скажэньні клясавай лініі рабкімі арганізацыямі яшчэ ня выпраўлены.

Я. ЖЫЛКА.

ЗАМЕСТ 595 ТОН— 182 ЦЭНТНЭРЫ

КРЫЧАЎ.

Па крычаўскім раёне на 10 верасьня выкананна толькі 12,2 проц. гадавога пляну

Асноўная прычына адставаньня раёну хаваецца ў адсутнасьці масавай работы вакол загатовак і зусім недастарчальным націску на кулацка-заможныя гаспадаркі.

Па некаторых сельсаветах (Крычаўскім, Касьцюковіцкім і інш.) ад адаасобнікаў не паступіла яшчэ ніводнага кілё збожжа.

Міхееўскі і Балускі сельсаветы адносяцца прымірэнча да кулацка-заможных гаспадарак, якія злосна саботуюць збожжазагатоўкі. Да гэтага часу кулакі ня здалі яшчэ ніводнага цэнтнэра збожжа.

Усяго па раёне па цьвёрдых заданьнях замест 595 тон збожжа, паступіла толькі... 182 цэнт.

Трэба бязьлітасна ўдарыць па апартуністычнай практыцы паасобных сельсаветаў, прымусіць іх неадкладна спагнаць збожжа па цьвёрдых заданьнях

За першы квартал прамфінпляна на заводзе «Дзяваапрацоўшчык» выканан на 98,7 проц., за другі — 79,61 проц., за наўгодзьдзе — 88,7 проц. І па сёнешнім заводзе «Дзяваапрацоўшчык» выканаў дзіцца ў паласе прарываў. За жнівень прамфінплян выканан усяго на 89,6 проц.

Бюро парткалектыву заслухоўвала справаздачы аб становішчы выкананьня прамфінпляну, выносіла рэзалюцыі, давала ўказаньні. І ў перабудове работы сёе-тое зроблена арганізацыйна. Арганізавана 8 цэхавых ячэек, выдучыні партарганізатараў і інш.

Калі наглядзець знадворку, здаецца што «на шыцы ўсё спакойна». Але на справе зусім другое. Партыйнае кіраўніцтва ня здолела ўхапіцца за асноўнае зьвяно работы, ня здолела сапраўды перанесьці цэнтр цяжару работы ў ніза выя зьвяньні вытворчасьці — цэх, групу, зьмену.

Ня гледзячы на тое, што ў радзе груп стварэюцца прарывы групавыя партэрга нізатары не мабілізуюць рабочых на ліквідацыю гэтых прарываў на ходу, а чакаюць пакуль разгледзіць станоўішча бюро цэхячэйкі, або бюро калектыву. Такім чынам, не прасякаючы карэньні прарываў, апошнія распаўсюджваюцца і ахапляюць увесь цэх.

Бюро парткалектыву не забясьпечыла правільнага разьмеркаваньня партсіл і апэрацыйнасьці ў кіраўніцтве на ўсіх участках вытворчасьці.

Бюро парт'ячэйкі зборачнага цэху нават не разглядала прычыны прарыву свайго цэху. Ва ўдарных брыгадах партыйцы не паказваюць узораў бальшавіцкай работы, а наадварот цягнуцца ў хвасьце.

Былое кіраўніцтва цэху распушчана за апартуністычную практыку. Камісія па абсьледваньні адпачынку адсутнасьць работы партарганізацыі ў зборачным цэху.

ПАРТОРГІ працуюць слаба

На гаспадарчы разрахунак пераведзены толькі цэхі. Брыгады чамусьці не пераводзяцца. Член бюро калектыву тлумачыць гэта тым, што ў іх няма яшчэ належнага вопыту ў рабоце.

Апартуністычная боязьць «як-бы чаго ня вышла» яшчэ пакуе ў рабоце некаторых кіраўнікоў. Сотні брыгад, на шмат якіх заводах Беларусі, пераведзены на гаспадарчы разрахунак, на практыцы даказалі, што гаспадарчы разрахунак узьнімае прадукцыйнасьць працы, якасьць выпусканай прадукцыі, зьніжае сабекошт апошняй. А кіраўнікі «Дзяваапрацоўшчыка» чамусьці чакаюць вопыту.

Зараз на заводзе ўводзіцца прэміяльна-групавая аўдзельшчына. Была накіравана група рабочых у Бабруйскі камбінат для вывучэньня пастаноўкі работы на прэміяльнай аўдзельшчыне.

На заводзе ўстаноўлен так званы тэхнічны кантроль. Раней бывала так. Матар'ялы ад лесапільнага цэху праходзілі бяз усякай тэхнічнай праверкі ў загатоўчы цэх. У заключным—зборачным цэху было вельмі шмат браку. Цяпер-жа ў кожным цэху, у кожнай зьмене ўстаноўлен спэцыяльны тэхнічны кантроль, які бракуе тут-жа каля вартыяту ідучыя работы. Калі зборачны цэх аддаваў раней 60 проц. дзяючага рабочага часу на ліквідацыю браку, атрыманага ад іншых цэхаў, дык цяпер гэта зьявішча зьніжчана.

Для таго, каб увесь завод вывесьці з прарываў парткалектыву трэба перабудаваць сваю работу па-новаму, мабілізаваць усе сілы на рэалізацыю ўказаньняў т. Сталіна.

С—н.

Да вынікаў месячніку беларусізацыі

Нацкамісія Менгарсавету ня ведае ці ва ўсіх ўстановах праведзена праверка

Месячнік беларусізацыі па некаторых установах гор. Менску не ерабіў патрэбнага пералому ў выкананьні дырэктыў партыі аб беларусізацыі.

Некаторыя работнікі ня толькі не вялі барацьбы з падпалашкай нацыянальнага пытаньня, але самі яго ігнаравалі.

Саюз сацзабесьпячэньня месячнік беларусізацыі сарваў. Бюро парткалектыву гэтай справе аддало зусім мала ўвагі. Выў складзен плян і толькі. Грамадзкасьць па гэтым самым ня была мабілізавана вакол месячніка. А таму год праверкі беларусізацыі па радзе ўстаноў даў неадавальняючыя вынікі. Старшыня праўленьня арцелі № 1 тав. Цырэін (камуніст) адказвае: «лёзунг—нацыянальная культура па форме і пралетарская па зьместе—гэта ўстаноўка нацдэмаўская». Гэта кідае прамень сьвятла на тое, якую работу ён мог праводзіць па ажыцьцяўленьні задач нацыянальнай палітыкі партыі.

Недаацэнкі месячніка беларусізацыі і на фабрыцы «Беларуска». Створаны гурток на вывучэньні беларускай мовы работы не распачаў. Між тым на фабрыцы мелі месца выпадкі антысэмітызму і адліквідаваны ня быў арганізавана выстарчальная ўвага грамадзкасьці.

9 членаў партыі і 28 камсамольцаў на хлебазаводзе зусім уклінілася ад праверкі. Член партыі тав. Шустэрман катэгарычна адмовіўся ад праверкі беларусізацыі.

На лепш справа з падрыхтоўкай і праведзеньнем месячніка беларусізацыі на радзе ўстаноў гораду. Вось букет харовых выдкадзяржаўніка, якія інтэрвалі беларусізацыю: Лёўшыц (Белгаз), які залічу раз падкрэсьліне, што толькі ў СССР магчымы буйны рост рэвалюцыі нацыянальных культур пад кіраўніцтвам УсеКП(б).

Сапаўў

ПРЫВІТАНЬНЕ ЦК КП(б)Б

Урачысты сход працоўных гор. Харкаву, разам з прадстаўнікамі пралетарскага мастацкага фронту БССР — Беларускім дзяржаўным ансамблем народных інструментаў — плюць кіраўніку нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў Савецкай Беларусі — ЦК КП(б)В пралетарскае прывітаньне.

Пралетарыят Харкава адзначае, што Савецкая Беларусь, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, атрымаць вялікія дасягненьні ў галіне стварэньня культуры, нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьместе. Аб гэтым таксама сьведчаць гастролі ў Харкаве БДТ-1 і беларускага дзяржаўнага ансамбля народных інструментаў. Урачысты сход яшчэ раз падкрэсьліне, што толькі ў СССР магчымы буйны рост рэвалюцыі нацыянальных культур пад кіраўніцтвам УсеКП(б).

Паведамленьні

— 23 верасьня ў 7 гадз. вечара адбудзецца нарада кіраўнікоў лёгкай кавалерыі супольна з актывам ЛК Менску у памяшканьні ЦКК-НК РСІ (Савецкая, 55, першы паверх, Бюро Скаргаў).

Яўка абавязкова.

— Прыезд паэты Александра Жарова. 21 верасьня, у Доме Камасьветы імя Карла Маркса і 22 верасьня ў дзяржтэатры адбудуцца літаратурныя вечары прыбыўшага з Масквы паэты А. Жарова.

У гэтых вечарох А. Жараў зробіць даклад на тэму: «Фронт будаўніцтва — фронт літаратуры».

Пасьля дакладу — чытка раду сваіх твораў. Вершы: «Люди Октября», «Своя кровь», «Марія ударникам»; паэма «Гармонь»; адрыўкі: «Азиаты», «Сентиментальный друг»; зірыкі: «О комсомоле», «О стройке», «О красной армии».

„ЧЫРВ. ЗОРКА" Пач. 7; 8-45; 10-30 — Новы гукавы мастацкі фільм АДНА драма ў 7 частках.

„КУЛЬТУРА" Пач. у 7; 8-45; 10-30 — Новы мастацкі яўрэйскі фільм Чалавек з мястэчка

ПРАЛЕТАРЫ Адкр. в 12 г. дня. — Мастацкі фільм РЭЙС МІСТЭРА ЛЕЙДА Звыш праграмы БРОНЕЦЭНГІН

„Юны Піянэр" (будынак кіно „Культура") — ІГАР ІЛЬІНСКІЙ у камедыі КАЛІ ПРАБУДЖАЮЦЦА МЁРТВЫЯ Пач. у 1 г. і 2 г. 30 м. Каса—з 11 г. дня.

КІНО „СПАРТАК" Пачатак сэансаў: 7-15, 9 і 10-45 Каса адкрыта ад 6 г. — З панядзелка, 21 верасьня—2-я пацыдзеўка БЫТАВЫ ФІЛЬМ КАФЭ ФАНКОНІ Драма ў 6 частках

На падставе пастановы ВСНГ БССР, Галоўлеспрому і Беллеспрому,
БЕЛАРУСКІ ЛЕСАТЭХНІЧНЫ ІНСТЫТУТ
абвяшчае з 20 верасьня па 1 кастрычніка г.г.,
ПРЫЁМ ЗАЯЎ У ДЗЕННЫ РАБФАК
ПРЫ ІНСТЫТУЦЕ,
ЯКІ АДКРЫВАЕЦЦА Ў Г. БАРЫСАВЕ.
На рабфак прымаюцца асобы не маладзей 17 і не старэй 28 год і належаць паводле свайго паходжаньня да рабочых з бытавым стажем на меншы 3-х год, калгаснікаў і іх дзяцей; перавага пры прыёме прадастаўляецца калгаснікам-адыходнікам, якія працуюць на лесанарыхтоўках, сплаву і дрэваапрацоўчай прамысловасьці.
Пры падачы заяў неабходна прадставіць наступныя дакументы: а) пасьведчаньне аб стажы фізычнай працы; б) аб узросьце; в) аб адносінах да вайсковай службы; г) аб асьвеце; д) аб стане здароўя; е) аб сацыяльным і матар'яльным становішчы паступаючага і яго бацькоў пасьля рэвалюцыі; ж) пасьведчаная анкета; з) для калгаснікаў-адыходнікаў—даведка ад дэсправгасу аб працы ў якасьці адыходніка.
Усе паступаючыя на рабфак праходзяць праверачныя іспыты па арытмэтыцы, беларускай і расійскай мовах у абязкове поўнага курсу 4-х груп 7-годкі і па палітграмаце.
Заявы прымаюцца ў канцылярыі інстытуту—г. Гомель, Савецкая, 49, і ў г. Барысаве, канцылярыя Лесгасвучу.
ДЫРЭКЦЫЯ.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" ПРАЦУЕ ад 12 гадз. дня.
Сёньня і штодзённа — Мастацкі фільм выв. „Межрабпом-фільм"
2 БУЛЬДЗІ 2
У галоўных ролях: А. СУДАКЕВІЧ, М. КОМАРАЎ.
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ—кіно-нарыс вытворчасьці Белдзяржкіно.
ПАЧАТАК дзённых сэансаў у 2 гадз. і 3 г. 30 м., вечарніх сэансаў 6-30, 8, 9-30 і 11 гадз.
Каса адкрыта з 12 гадз. дня.
Цэны на дзённых сэансы ЗНІЖАНЫ.

22 верасьня — Мендзяркітэатр — ВЯЛІКІ ЛІТАРАТУРНЫ ВЕЧАР паэта АЛЕКСАНДР ЖАРАЎ
1. Даклад. 2. Ўтарская чытка. 3. Ядказы на запіскі.
Білеты, якія засталіся, прадаюцца ў рабкасе і ў касе дзяржтэатру з 12—2 г. дня і з 4 да 9 г. 30 м. вечара.
ПАЧАТАК У 9 ГАДЗ. ВЕЧАРА.

Кошт публікацыі аб згубе дакумэнту 1 руб.

22 верасьня, роўна ў 7 гадз. веч., склікаецца АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ СХОД рэвізійных камісій ячэек МОПР'у
Сход адбудзец